ЛіМ

# Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 22 (4977) 8 чэрвеня 2018 г. ISSN 0024-4686

16+

*Крытыка для Маўра* *стар. 5*

*Чытаем у часопісах* *стар. 6*

*#космаснаш* *стар. 13*

# З думкамі пра радзіму

## Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2018» сустракае гасцей



Фота БелТА.

З моманту свайго ўзнікнення ў 1993 годзе фестываль у Маладзечне адлюстроўвае самыя значныя падзеі ва ўсіх сферах айчыннай культуры. Тут неаднаразова святкавалі юбілеі народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа, не абміналі ўвагай 75-годдзе Уладзіміра Караткевіча і паэзію Аркадзя Куляшова, нагадвалі пра стагоддзе з дня нараджэння народнага артыста Беларусі Іосіфа Жыновіча і гадавіны заснавання Маладзечна, прысвячалі канцэрты 60-годдзю Вялікай Перамогі, з размахам адзначалі 70 і 75-годдзе з дня нараджэння народнага артыста Беларусі і СССР Уладзіміра Мулявіна, мастацкага кіраўніка і заснавальніка легендарнага калектыву «Песняры» (акрамя святочнага канцэрта, у тэматычнай афішы значыўся і спектакль «Пясняр» Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага). Створаны кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі Міхаілам Фінбергам, фестываль з году ў год спрычыняе беларусаў да нацыянальных каштоўнасцей краіны, папулярызуе творы беларускіх кампазітараў і паэтаў, знаёміць гасцей з новымі таленавітымі выканаўцамі.

Працяг тэмы на стар. 15 ▶

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 18022

## *Акцэнты тыдня:*

## краіна

Дзяржаўны клопат. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне «Аб падтрымцы культуры і мастацтва». Дакументам зацверджана рашэнне савета фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва і прадугледжваецца выдзяленне грашовых сродкаў для рэалізацыі трох праектаў. Гэта, у прыватнасці, праекты па выкананні рэстаўрацыйных работ у Косаўскім палацава-паркавым ансамблі, а таксама правядзенні мерапрыемстваў па кансервацыі і рэстаўрацыі Гальшанскага і Крэўскага замкаў. Прыняцце распараджэння будзе садзейнічаць захаванню помнікаў архітэктуры і гісторыі Беларусі на доўгатэрміновы перыяд, павелічэнню іх турыстычнага патэнцыялу.

Кнігі і святы. Беларускія кнігі былі прадстаўлены на IV Маскоўскім кніжным фестывалі «Красная плошча». Гэты аўтарытэтны штогадовы форум аб'ядноўвае сучасных аўтараў і выдаўцоў. На нацыянальным стэндзе можна было ўбачыць навінкі айчыннага кнігавыдання, у тым ліку прысвечаныя знакавай для краіны даце — 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Экспановаліся выданні да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, да 950-годдзя Мінска. Сёлета на маскоўскім фестывалі ААТ «Белкніга» прадставіла найбуйнейшы кніжны магазін сталіцы — «Дом кнігі "Светач"». Кнігі беларускіх выдаўцоў выклікалі вялікую цікавасць у наведвальнікаў форуму. Падчас фестывалю адбыліся літаратурныя вечары, прэзентацыі кніг, аўтограф-сесіі.

Плён стасункаў. У Мадрыдзе пры садзейнічанні Пасольства Беларусі ў Іспаніі выступілі музыканты з Гродна, паведамілі ў дыпламатычнай місіі. На канцэрт былі запрошаны прадстаўнікі беларускай дыяспары і іспанскай грамадскасці. Пасля дыпламаты пасольства (урачыстае адкрыццё офіса якога адбылося ў Мадрыдзе на мінулым тыдні) правялі сустрэчу з беларускімі грамадзянамі, якія пастаянна пражываюць у Іспаніі, і адказалі на надзённыя пытанні.

Ў нашай краіне ўпершыню прайшлі Дні культуры Татарстана. У Мінску і Гродне адбыліся паказы дакументальных, мастацкіх і анімацыйных фільмаў вытворчасці рэспублікі, выстаўкі выяўленчага мастацтва і фотавыстаўкі, круглыя сталы па пытаннях рэалізацыі этнакультурных ініцыятыў на базе ўстаноў культуры. Абмен досведам у бібліятэчнай справе, творчыя вечары дзеячаў культуры і мастацтва, выстаўкі-кірмашы народных мастацкіх промыслаў — такімі падзеямі былі насычаныя Дні культуры.

Учаканні падзеі. Больш як 110 тыс. гасцей і ўдзельнікаў збяруцца на рэспубліканскім свяце «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»), якое пройдзе 7—8 ліпеня на беразе Дняпра ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна. Падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай арганізацыі і правядзенню адной з галоўных культурных падзей гэтага лета, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Андрэй Кунцэвіч паведаміў, што асаблівая ўвага на свяце будзе ўдзелена тэме Года малой радзімы. На галоўнай сцэнічнай пляцоўцы гасцям прапануюць тэатралізаваны паказ «Малая радзіма», які рыхтуе рэжысёрска-пастановачная група тэлеканала АНТ. Рэгіёны краіны прадставяць свае фестывальныя праекты. Гасцей таксама чакаюць конкурс на лепшы купальскі касцюм, выстаўка-кірмаш аграэкатурызму, прэзентацыя праекта «Магілёў — маладзёжная сталіца Рэспублікі Беларусь», фестываль фарбаў, канцэртная праграма ад музычна-спартыўнага свята «Вялікая бард-рыбалка».

**Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ**

# «КАЛІ ЛАСКА» ГУЧЫЦЬ ПАЭТЫЧНА

## Беларусь — Татарстан: новыя праекты

На гэтым тыдні ў краіне гасцююць дзеячы культуры і мастацтва з Татарстана (Расійская Федэрацыя). У складзе дэлегацыі — і народны паэт Татарстана, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі Рэнат Харыс.

У Міністэрстве інфармацыі адбылася рабочая сустрэча з татарскім літаратарам, грамадскім дзеячам. Прадметам размовы стала і выдадзеная ў Казані літаральна днямі своеасаблівая анталогія беларускай паэзіі на татарскай мове — «Хуш кілезэс — калі ласка: беларускія паэты». Сімпатычны зборнік уклалі Рэнат Харыс і Алесь Бадак. Перакладчык вершаў усіх 30 паэтаў — Рэнат Харыс.

Фота Кастуся Дробава.

Размова на сустрэчы, удзел у якой з беларускага боку ўзялі міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч і дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак, ішла не толькі пра беларуска-татарскія літаратурныя стасункі. Рэнат Харыс згадаў цэлы шэраг прозвішчаў беларусаў, якіх выпеставала татарская зямля, расказаў пра пісьменнікаў, дзеячаў культуры, якія загінулі на Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Былі выкладзены ідэі стварэння зборніка нарысаў пра лёсы, аднолькава важныя для гісторыі Беларусі і Татарстана. «Добра было б аднавіць і традыцыю правядзення Дзён нацыянальных літаратур, — заўважыў Рэнат Харыс. — Мы чакаем у Казані, у розных раёнах Татарстана беларускіх паэтаў, празаікаў. Упэўнены: наш паэтычны народ з задавальненнем будзе слухаць вершы ў выкананні аўтараў з Беларусі. Відавочна, што больш цесна павінны супрацоўнічаць і нашы літаратурна-мастацкія выданні. Я асабіста заўсёды з задавальненнем чытаю ваш часопіс "Нёман", сачу ў інтэрнэт-прасторы і за іншай літаратурна-мастацкай перыёдыкай, што выдаецца ў Мінску, у тым ліку — і на беларускай мове».

— Мы абавязкова распрацуем праграму супрацоўніцтва з Татарстанам у галіне масмедыя, улічым усе вашы пажаданні. І мы вельмі ўдзячны вам за ўвагу да беларускай літаратуры, — падсумаваў вынікі размовы міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч.

**Мікола БЕРЛЕЖ**

# Любіч вяртаецца. Любіча вяртаюць

## Нацыянальны мастацкі музей стаў багацейшы яшчэ на адзін твор мастака Парыжскай школы

Мастака Восіпа Любіча сёння ставяць у адзін шэраг з Маркам Шагалам і высока ацэньваюць кошт яго мастацкіх твораў. Першага чэрвеня ў краіне адбылася важная падзея: Пасольства Рэспублікі Беларусь у Швейцарскай Канфедэрацыі перадало ў дар жывапісны твор «Нацюрморт са збанам» ураджэнца Гродзеншчыны і мастака Парыжскай школы Нацыянальнаму мастацкаму музею Рэспублікі Беларусь.

Гэта ўжо другі твор майстра, які папоўніў калекцыю музея. Першы падарылі паўгода таму. Яшчэ тады падзея выклікала рэзананс. Карціна трапіла ў музей дзякуючы фінансавай падтрымцы Ганаровага консула Беларусі ў Цюрыху Атанасіяса Акратаса. Ён набыў нацюрморт падчас прыватнага аўкцыёну ў Ізраілі.

— Паўгода таму, калі мы сустракаліся ў Нацыянальным мастацкім музеі, каб перадаць карціну «Маленькі букет кветак», я выказаў надзею, што ён «пусціць карані» і калекцыя павялічыцца, — падкрэсліў на ўрачыстай цырымоніі часовы павераны ў справах Беларусі ў Швейцарыі Павел Мацукевіч. — Сёння пакуль рана казаць пра сапраўдную калекцыю, але мы з'яўляемся сведкамі гістарычнай падзеі. Ёсць тэндэнцыя да развіцця, і патэнцыялу хапае. Тое, што творы вяртаюцца на радзіму аўтараў, — гэта заўсёды свята.

Цяпер у Нацыяналным мастацкім музеі існуе спецыяльная праграма па вяртанні гісторыка-культурных каштоўнасцяў у краіну. Яна рэалізоўваецца пад патранатам Міністэрства культуры і пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Беларусі. Мінулы год паказаў, што механізм праграмы працуе. Творы Восіпа Любіча якраз з'яўляюцца гэтаму доказам.

Пакуль «Нацюрморт са збанам» вывучаецца профільнымі спецыялістамі. А пасля стараннага даследавання музейны экспанат будзе дэманстравацца на тэматычных выстаўках Нацыянальнага мастацкага музея і іншых музеяў Беларусі.

**Вікторыя АСКЕРА**

**Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:**

***11 чэрвеня*** *— на літаратурную імпрэзу «Чытаем разам з пісьменнікам» у межах акцыі «Лета з добрай кнігай» у дзіцячую бібліятэку № 16 (аб 11.00).*

***11 чэрвеня*** *— у Школу юнага паэта пры Мінскім гарадскім аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі (а 14.00).*

***12 чэрвеня*** *— на творчае свята «Літаратурнае падарожжа па Лагойшчыне», прымеркаванае да Года малой радзімы, у Янушкавіцкую бібліятэку Лагойскага раёна (а 10.00).*

***12 чэрвеня*** *— на прэзентацыю кнігі вершаў Міхася Пазнякова «Юнаму сябру» ў межах акцыі «Лета з добрай кнігай» у публічную бібліятэку № 5 (аб 11.00).*

***12 чэрвеня*** *— у літаратурны клуб «Слова» пры публічнай бібліятэцы № 3 на творчую імпрэзу з удзелам літаратараў (а 14.00).*

***13 чэрвеня*** *— у клуб юных літаратараў «Шабаноўскія званочкі» пры дзіцячай бібліятэцы № 3 (аб 11.00).*

**Мінскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:**

***12 чэрвеня*** *— на сустрэчу з Ірынай Карнаухавай у сярэднюю школу № 4 г. Нясвіжа (аб 11.00).*

***12 чэрвеня*** *— на сустрэчу з Бажэнай Мацюк у Мінскую цэнтральную раённую бібліятэку (а/г Міханавічы) (аб 11.00).*

***13 чэрвеня*** *— на сустрэчу з Валянцінай Гіруць-Русакевіч і Марыяй Шакун у Ярашэвіцкую (а 10.00) і Ракаўскую сярэднюю школу Валожынскага раёна (а 12.00).*

***14 чэрвеня*** *— на сустрэчу з Ірынай Карнаухавай «Навошта челавеку канікулы?» у бібліятэку а/г Лясны Мінскага раёна (аб 11.00).*

***15 чэрвеня*** *— на сустрэчу «Малая радзіма — вялікая любоў» Святланы Быкавай з юнымі філолагамі Міханавіцкай сярэдняй школы (а 14.30).*

**Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:**

***12 чэрвеня*** *— на літаратурную сустрэчу з Таццянай Дземідовіч у бібліятэку-філіял № 9 г. Брэста ў межах работы школьнага лагера (а 10.00).*

**Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:**

***9 чэрвеня*** *— на XVIII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2018». Літаратурныя сустрэчы з удзелам Тамары Красновай-Гусачэнкі (канцэртная зала Палаца культуры г. Маладзечна) (аб 11.00).*

***12 чэрвеня*** *— на творчую сустрэчу з Сяргеем і Галінай Трафімавымі «Кніжная эстафета сонечнага лета» ў Высокаўскую сельскую бібліятэку Аршанскага раёна (аб 11.00).*

***13 чэрвеня*** *— на літаратурную сустрэчу з Галінай Загурскай і Мікалаем Балдоўскім «Дзяцінства шчаслівыя імгненні», прысвечаную Году малой радзімы, у школьны лагер Полацкай СШ № 6 (аб 11.00).*

***13 чэрвеня*** *— на творчую сустрэчу з Сяргеем і Галінай Трафімавымі ў Межаўскую сельскую бібліятэку Аршанскага раёна Віцебскай вобласці (а 10.00).*

***14 чэрвеня*** *— на пазнавальную гадзіну з Сяргеем і Галінай Трафімавымі «Дзед Прыродавед пра тайны і загадкі прыроды» ў Андрэеўшчынскую сельскую бібліятэку Аршанскага раёна (аб 11.00).*

**Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:**

***13 чэрвеня*** *— на сустрэчу бібліятэкараў Гродзенскай вобласці з Людмілай Кебіч, Людмілай Шаўчэнкай і Ганнай Скаржынскай-Савіцкай у Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў (а 10.00).*

*У Саюзе пісьменнікаў Беларусі*

# ДАЛЁКА І БЛІЗКА

Кніга перакладаў «Радка жывога пілігрымы...», якая выйшла ў серыі «Бібліятэка Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі» (Мінск, Колорград, 2018), была прэзентавана ў Аранбургу.

VI Міжнародны фестываль садружнасці нацыянальных літаратур «Красная гара — 2018», на якім мне пашчасціла пабываць, прайшоў у Расіі, на аранбуржскай зямлі.

Фестываль, як культурная падзея рэгіёна, сустракаў гасцей з Арменіі, Башкіріі, Татарстана і Беларусі не толькі святочным надвор'ем, але разнастайнымі мерапрыемствамі. Найбольш адметным атрымаўся вечар нацыянальнай і перакладной літаратуры «Радкі сяброўства».

Адбыліся сустрэчы з моладдзю ў адукацыйных установах, вечар літаратурных выданняў, дзе быў прадстаўлены і часопіс «Белая Вежа», літаратурнае шоу «Бітва пакаленняў», юбілейны творчы вечар паэтэсы і галоўнага рэдактара рэгіянальнага часопіса «Гостиный Дворъ», аўтарская выстаўка фотамастака і пісьменніка Лявона Асяпяна, акцыя «Вершы на асфальце».

Поўныя аўдыторыі неабыякавых гледачоў, цікавасць у вачах шматлікіх аматараў пацвердзілі даўно вядомую ісціну: калі пісьменнік піша на мове душы, будзе зразумелы не толькі на сваёй радзіме.

**Іна ФРАЛОВА**

# …Не хобі?

## Першая выстаўка творчых дасягненняў навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў

Мастацтвазнаўцы сцвярджаюць, што дзіцячая творчасць самая адкрытая і эмацыянальная, таму трэба развіваць патэнцыял моладзі, каб больш цікавіцца мастацкімі працэсамі сучаснасці, паказаць дзецям, што іх творчасць запатрабаваная і актуальная. З гэтай нагоды тыдзень таму ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася выстаўка творчых дасягненняў навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў Беларусі ў рамках Міжнароднага тыдня мастацкай адукацыі ЮНЕСКА.

Выстаўка — першы ў сваім родзе праект у Беларусі, у рамках якога ўсім дзіцячым школам мастацтваў рэспублікі была прадстаўлена магчымасць прадэманстраваць дасягненні сваіх вучняў. Экспазіцыя адрозніваецца разнастайнасцю жанраў і тэхнік, а таксама багаццем ідэйна-тэматычных задум.

— У мяне ўзнікла ідэя арганізаваць такі праект падчас гутаркі з педагогамі і навучэнцамі, — расказаў арганізатар выстаўкі дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Павел Сапоцька. — У нас высокі ўзровень мастацкай адукацыі і шмат таленавітых маладых людзей, але яны, на жаль, абмежаваныя ў выставачнай дзейнасці, папулярызацыі ўласнай творчасці. Для дзяцей гэта ўнікальная магчымасць, бо яны сапраўды могуць зразумець, што іх захапленне мастацтвам не проста хобі, а, магчыма, будучая прафесія.

Праект прафінансаваны з бюджэту спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі і арганізаваны пры садзейнічанні Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з мэтай трансляцыі дасягненняў будучага пакалення творцаў у сферы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва шырокай беларускай і замежнай аўдыторыі, выяўлення новых імёнаў у сучасным беларускім мастацтве.

— З тысячы твораў мы адабралі каля трохсот. Элемент спаборніцтва, на мой погляд, павінен быць абавязкова, таму што гэта выстаўка не проста творчасці, але і дасягненняў, — падкрэслівае Павел Сапоцька. — Прыемна, што многія мастацкія творы дэманструюць нам маленькія гарады і рэгіёны, адкуль прыехалі юныя мастакі. Важна, што моладзь звяртаецца да гісторыка-культурнай спадчыны, паказвае ў творах вядомых дзеячаў нацыянальнай культуры і гісторыі.

**Вікторыя АСКЕРА**

*Памяць*

# Палыновая ростань Эдуарда Зарыцкага

На 73-м годзе жыцця не стала народнага артыста Беларусі, кампазітара Эдуарда Зарыцкага. Гэта быў вельмі светлы, добры і самаахвярны чалавек, з адметным пачуццём гумару, які годна ўспрымаў любыя цяжкасці і выпрабаванні.

Эдуард Зарыцкі нарадзіўся 9 лютага 1946 года. У 1964 годзе скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя Глінкі, у 1970-м — Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класе кампазіцыі прафесара Анатоля Багатырова. Зарыцкі быў вядомы найперш як кампазітар-песеннік. Сярод яго найлепшых твораў — «Белыя крылы», «Паспяшайся, кумок», «Зорачка», «Замова», «Начныя кастры», «Будзьма», «Палыновая ростань» ды іншыя. У яго творчым багажы — больш за 600 песень.

Шмат гадоў кампазітар працаваў у Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестры пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга, дзе з поспехам выконваліся яго вакальныя цыклы на вершы беларускіх паэтаў: Адама Міцкевіча (у перакладзе Васіля Жуковіча), Рыгора Барадуліна, Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча, Генадзя Бураўкіна. Сярод асноўных твораў акадэмічнага жанру, створаных Зарыцкім, — сімфонія, тры канцэрты, некалькі сюіт, вакальныя цыклы і камерна-інструментальная музыка. Кампазітар напісаў музыку больш як да 30 спектакляў і фільмаў, а таксама мюзікла «Белыя росы». У Саюз кампазітараў БССР Эдуард Зарыцкі быў прыняты ў 24 гады і шмат гадоў з'яўляўся намеснікам старшыні яго праўлення. Акрамя таго, Зарыцкі быў старшынёй журы дзіцячага адборачнага конкурсу «Еўрабачанне», членам рэпертуарнай камісіі Міністэрства культуры і аўтарскага савета Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці.

Пахаванне народнага артыста адбудзецца 8 чэрвеня.

# ЛІТАРАТУРА АБ'ЯДНОЎВАЕ

Больш як сто пісьменнікаў з дзесяці краін свету прыехалі ў Беларусь паўдзельнічаць у V Міжнародным літаратурным форуме «Славянская ліра — 2018», які адбыўся ў Мінску з 31 мая па 3 чэрвеня.

Юбілейны форум адкрыўся аглядной экскурсіяй для літаратараў, якія з задавальненнем пазнаёміліся са славутасцямі горада і змаглі ацаніць інфраструктуру сталіцы. Далей усе асноўныя мерапрыемствы адбываліся на пляцоўцы Дома Масквы. У рамках «Славянскай ліры — 2018» прайшлі разнастайныя майстар-класы, круглыя сталы, дыскусіі, літаратурная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю Першай сусветнай вайны. Таксама ўдзельнікі форуму наведалі мемарыяльны комплекс «Хатынь».

Форум — гэта перш за ўсё магчымасць мець зносіны з калегамі, падкрэс-лівалі арганізатары. Хтосьці з іх ужо адбыўся ў літаратуры і валодае сакрэтамі майстэрства паэтычнай кухні, прозы ці драматургіі, а камусьці яны патрэбны цяпер, каб развівацца, лічаць, у прыватнасці, ініцыятары з літаратурнага саюза «Полацкая галіна». Гэтаму былі прысвечаны майстар-класы. У межах форуму прайшоў літаратурны конкурс «Славянская ліра», у якім прадугледжана пяць намінацый: «Паэзія. Свабодная тэматыка», «Паэзія. Пейзажная лірыка», «Малая проза», «Мастацкі пераклад», «Драматургія».

**Вікторыя АСКЕРА**

ЛіМ КАЛЯНДАР

**9 чэрвеня** — 215 гадоў з дня нараджэння Адольфа Міхала Валяр'яна Юліяна Янушкевіча (1803—1857), падарожніка, пісьменніка.

**9 чэрвеня** — 105 гадоў з дня нараджэння Тамары Міянсаравай (1913—1990), піяністкі, заслужанай артысткі БССР.

**9 чэрвеня** 60 гадоў святкуе Сяргей Асапрылка, жывапісец.

**10 чэрвеня** 60-гадовы юбілей адзначыць Таццяна Канапацкая, журналіст, краязнаўца.

**10 чэрвеня** 45 гадоў святкуе Ніна Загараўская, пісьменніца.

**10 чэрвеня** 50-годдзе адзначае Наталля Хаткевіч, рэжысёр, сцэнарыст, мастак.

**13 чэрвеня** —115 гадоў з дня нараджэння Эдуарда Шапко (1903—1977), акцёра, заслужанага артыста БССР.

**14 чэрвеня** — 95 гадоў з дня нараджэння Вацлава Смаля (1923—1994), кіназнаўцы.

*Люстэрка тыдня:*

## свет

У межах Дзён культуры Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам у Беларусі 13 чэрвеня ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь пачне працаваць выстаўка «Нацыянальны касцюм і народныя промыслы В'етнама». Экспазіцыя складаецца з калекцыі традыцыйных лакафарбавых вырабаў, прадметаў з бамбуку і ратангу, сусветна вядомай керамікі з вёскі Батчанга, 20 касцюмаў этнічных груп В'етнама (у тым ліку і традыцыйная сукенка Аазай) ды іншых аб'ектаў. Розныя рэгіёны краіны прадстаўляюць калекцыю лялек у этнічных касцюмах ды разнастайныя вырабы з шоўку і парчы. Мэта выстаўкі — пазнаёміць беларусаў з самабытнай культурай В'етнама, якая знаходзіцца на мяжы мастацтва і рамяства ды старанна захоўваецца ў вёсках таленавітымі майстрамі.

Песні беларускага гурта «*J*:морс» загучалі ў новым расійскім серыяле «Былыя» (у Беларусі першы сезон «Былых» ідзе па буднях на тэлеканале АНТ). Серыял ад рэжысёра Івана Кітаева («Сямейны бізнес», «Што і трэба было даказаць»), які пабудаваны на адносінах паміж нарказалежнай Янай і псіхолагам Ільёй, — псіхалагічная драма, якая распавядае пра цяжкасці на шляху да вызвалення ад нарказалежнасці. За кадрам — хіты папулярнага айчыннага гурта: песні «Ледоколы», «Дажджом», «*Web*-дызайн» і «Басанож па маставой» (у створанай адмыслова для ТВ-праекта новай версіі). Гэта не першае з'яўленне песень «*J*:морс» у якасці саўндтрэка: у лютым 2018 года гурт прагучаў у фільме «Нямы» («*Mute*») рэжысёра Дункана Джонса, вядомага па фільмах «Зыходны код», «Месяц 2112», «Варкрафт».

У *Instagram*-акаўнце музычнага калектыву «*Holliwood Vampires*», удзельнікам якога з'яўляецца знакаміты галівудскі акцёр Джоні Дэп, з'явілася фатаграфія разам з маладым беларускім скульптарам і яго вырабам. Скульптар Стас Нікановіч зрабіў мініяцюрную копію Джоні Дэпа і асабіста падарыў яе акцёру падчас канцэрта гурта ў Маскве. Музыкі з «*Holliwood Vampires*» і Дэп у прыватнасці так упадабалі работу, што сфатаграфаваліся са скульптурай і яе аўтарам, а пасля змясцілі здымак на сваёй афіцыйнай старонцы са словамі падзякі. Дагэтуль беларускі творца ўжо працаваў над выявамі знакамітасцяў: такія ж статуэткі належаць спеваку Сяргею Шнураву і расійскаму журналісту Уладзіміру Познеру.

Былы прэзідэнт ЗША Біл Клінтан выпусціў свой першы раман (раней палітык апублікаваў чатыры кнігі, але яны не былі мастацкія) пад назвай «Прэзідэнт знік» («*President is Missing*»). Суаўтарам кнігі стаў папулярны пісьменнік, аўтар вострасюжэтных раманаў аб прыгодах дэтэктыва Алекса Кроса Джэймс Патэрсан, фанатам творчасці якога прызнае сябе Біл Клінтан. Па кнізе, дзе экс-прэзідэнт засяроджвае ўвагу на дакладнасці апісання жыцця ў Белым доме, пачалі здымаць серыял.

У Яраслаўлі з'явілася незвычайная скульптура — помнік згубленаму кашальку. Жалезнае партманэ наўпрост ляжыць на адной з вуліц горада і выглядае зусім як сапраўдная страта мінака-небаракі. Між іншым, пад асфальтам выраб замацаваны металічным штыром даўжынёй у метр: прадпрымальнік і гісторык Ян Левін, які праспансіраваў стварэнне помніка, запэўнівае, што паварушыць партманэ немагчыма. Але гэта не замінае гараджанам, якія яшчэ не ведаюць пра з'яўленне ў Яраслаўлі новай скульптуры, блытаць яе са звычайным кашальком і марнаваць час на беспаспяховыя спробы падняць «знаходку».

**Агляд цікавінак ад Дар'і ЧАРНЯЎСКАЙ**

# «ПАРНАС ГУДЗЕ!»

## У Гарадку падчас адмысловага свята згадалі легендарную паэму

Дзясяты раз адгрымелі гармонікі і адгучалі песні і вершы, лірыка і гумар, танцы і жарты, тэатральныя мініяцюры, адшумелі міні-кірмашы на вулачках Гарадка, што на Віцебшчыне, у мінулыя выхадныя, калі адбывалася свята «Гарадоцкі Парнас».

«Свята ідзе! Парнас Гудзе!» — урачысты канцэрт з такой назвай сабраў творчыя калектывы Віцебскай вобласці. Асаблівым упрыгожаннем яго стаў танцавальны флэшмоб старадаўніх гарадоцкіх танцаў «Скокі ва ўсе бокі».

Але цэнтральнай падзеяй мерапрыемства было Свята паэзіі «Вераніцынская зорка». На адкрыцці свята мне як старшыні Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі хацелася нагадаць гісторыю стварэння паэмы «Тарас на Парнасе». Распавядала я пра ўстанаўленне аўтарства вядомым беларускім літаратуразнаўцам, гісторыкам, этнографам і даследчыкам Генадзем Кісялёвым у 1970 годзе. З моманту напісання паэмы — 15 красавіка 1855 года — у Гарадку прайшло мноства перавыданняў і перакладаў гэтага помніка беларускай літаратуры і культуры. Паэма ўключана ў школьную праграму. Але што цікава: твор напісаны Канстанцінам Вераніцыным у той час, калі яму быў усяго 21 год. Паэма з'яўляецца агульнапрызнаным помнікам сатырычнай лірыкі XIX стагоддзя, выдатная глыбінёй мастацкай ідэі і арыгінальнасцю літаратурнай формы, вастрынёй сатыры і вострым гумарам, жвавасцю і непасрэднасцю народнай думкі. Яе мова — жывы віцебскі дыялект таго часу. Акрамя таго, паэма, якой прысвечана гэта цудоўнае свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору, вылучаецца асаблівым стаўленнем да беларускага народа, разуменнем яго складанага лёсу, не заўсёды багатага на радасць, але ўвесь час поўнага цяжкай працы. Даследчыкі называюць паэму «жамчужынай беларускай паэзіі XIX стагоддзя».

*Падчас свята «Гарадоцкі Парнас».*

Паэтычнае свята прайшло з удзелам вядомых літаратараў Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Галіны Загурскай, Мікалая Балдоўскага, паэта з Расіі Аляксандра Лісняка, талентаў з літаратурнага клуба Гарадоцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі і іншых літаратараў.

Сёлета свята «Гарадоцкі Парнас» вызначалася размахам настайнасцю: па ўсім парку, вуліцах і на цэнтральнай плошчы горада прыцягвалі ўвагу гасцей і жыхароў тэматычныя пляцоўкі: «Тарасава сядзіба», «Музычны панадворак», «Рыбацкае шчасце», «Гульні на Парнасе», многія госці бралі ў іх актыўны ўдзел. Вялікую ўвагу арганізацыі свята штогод надае кіраўніцтва Гарадоцкага райвыканкама: старшыня Пётр Пятровіч Карабач, намеснік старшыні Марына Анатольеўна Здольнікава і кіраўнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па працы з моладдзю Вольга Уладзіміраўна Каўрыга.

Выстаўка-продаж вырабаў народных майстроў, майстар-класы па ўнікальных рамёствах Гарадоччыны, выстаўка «Кветкі багіні» ад народнага аб'яднання «Зялёная Альтанка» клікалі ўсіх на «Кірмаш ля Парнаса», які раскінуўся на Цэнтральнай плошчы. Можна было завітаць на выстаўку паляўнічых трафеяў «Леснічоўка». Юныя аматары жывапісу і графікі праводзілі пленэр «Любы сэрцу край», адначасова была арганізавана і выстаўка дзіцячых малюнкаў. «У Госці да палясоўшчыка» запрашалі жывапісныя сталы з прысмакамі беларускай кухні.

Побач у парку шумела весялосцю дзіцячая пляцоўка «Горад дзяцінства» з праграмай і забавамі для малых. А трошкі пазней разгарнулася выступленне творчых калектываў Гарадоччыны «Спявай душа народная», якое прыцягнула да сябе ўдзельнікаў свята вясёлымі і празрыстымі народнымі песнямі, якія да самага заходу сонца ліліся вуліцамі Гарадка...

**Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА,**
**старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі**

# Місія выконваецца,

## альбо Інтэлектуалізм у эпоху *Digital*

**Здаецца, што ў нас стала больш імпрэз, дзе ў цэнтры ўвагі кніга. Буйная міжнародная выстаўка, кніжныя фестывалі, якія ўзнікаюць праз ініцыятыву «знізу», прэзентацыі і сустрэчы, аўтограф-сесіі аўтараў у кнігарнях робяцца часцей. Прычыны могуць быць дзве: гэта патрэбна грамадству інтэлектуалаў (паводле статыстыкі пра колькасць у Беларусі людзей з вышэйшай адукацыяй, гэта так), ці грамадства зацікаўлена ў выхаванні інтэлектуалаў на будучыню.**

Абедзве прычыны важкія, каб дзеля іх жыць і служыць — выдаваць кнігі. Для каго? Хто наш чытач? Задаюцца пытаннямі выдаўцы, таму што соцыум перажыў некалькі трансфармацый за апошнія 30 гадоў. А пакаленне «нулявых» наогул (эпохі дзіджытал) складана зразумець з пункткту гледжання інтэлектуальных патрэб: яны, як правіла, не ездзяць у метро з кніжкамі ці часопісамі. Але не факт, што не чытаюць.

Хто такія беларускія інтэлектуалы сёння і якія кнігі ім патрэбны, імкнуліся зразумець у Мінску на мінулым тыдні. Шэраг круглых сталоў, дыскусій круціліся вакол фармулёўкі: што значыць быць інтэлектуалам? Вось Скарына — інтэлектуал? Доктар і выдавец, які, на думку даследчыцы Ірыны Дубянецкай, паўплываў на фарміраванне беларускай літаратурнай мовы, калі выдаваў Біблію «руску». І казаў пра свае матывы ў прадмовах — ад сябе. Інтэлектуал — гэта найперш чалавек, які не толькі дбае пра асабістыя веды, а мае што сказаць іншым, імкнецца данесці і адкрыць новы сэнс, гарызонт, свет, прагучала на фестывалі інтэлектуальнай кнігі «Прадмова». Але вось што цікава (ці час па-свойму расставіў акцэнты): Скарына выконваў місію асветы для іншых, але цяпер усё часцей гучыць думка пра тое, што інтэлектуалаў шмат не бывае, гэта людзі з даволі высокімі запытамі ў розных галінах ведаў, таму маюць патрэбы ў асаблівых кнігах, якія не будзе чытаць кожны. Найперш гэта філасофскія, навуковыя і спецыялізаваныя выданні. І тут ёсць пытанні: чаму на пачатку 90-х добра разыходзіліся кнігі Хайдэгера? Ці можа ў любыя часы быць запатрабаваны Бадрыяр? Як наогул зразумець, якога кшталту сур'ёзная кніга пойдзе на рынку? Ды і наогул, ці ёсць у рынкавай кніжнай прасторы ніша для інтэлектуальных выданняў?

Аднойчы выдавец кнігі на беларускай мове філосафа Жака Дэрыда зайшоў у піўную і пабачыў чалавека, які чытае гэтую кнігу. Гэта было на пачатку 90-х, калі можна было прадаць сусветных філосафаў у перакладзе тыражом у 1000 экзэмпляраў. А цяпер у тым жа выдавецтве Зміцера Коласа ляжыць выдадзеная «Так казаў Заратустра». Па словах выдаўца, ніводная кніга не прадавалася так кепска. І ўсё ж цікава: у Расіі, напрыклад, цяпер вельмі запатрабаваная нямецкая філасофія. Ці вось яшчэ Нікола Макіявелі аказаўся не вельмі патрэбны беларусам, серыя «Галерэя чалавечай думкі» наогул спынілася. І пры гэтым выдавец называе галоўнай праблемай нават не тую, што кніжкі разыходзяцца кепска (такія кніжкі павінны быць хоць бы нават для адзінкавага чытача!), а ў тым, што няма каму перакладаць літаратуру сур'ёзнага зместу: тут не проста слова адчуць і знайсці, а сэнс дакладна перадаць трэба, а такой школы ў нас няма, пры тым, што стварылася даволі вялікае кола перакладчыкаў у галіне мастацкай і дзіцячай літаратуры.

Ёсць адказ, чаму так адбываецца з перакладам сур'ёзнага чытання: уключаюцца спецыфічна беларускія праблемы: калі гуманітарныя веды транслявaліся праз Маскву, пераклад не быў патрэбны ў той сістэме культурнага жыцця. Дагэтуль захоўваецца сітуацыя, што шмат якая літаратура на рынак прыходзіць з Расіі, у тым ліку філасофскае чытанне. «Для нас удзячная ніша — гісторыя Беларусі. Таму што расійскаму чытачу гэта нецікава, акрамя нас гэта ніхто выдаваць не будзе, — лічыць выдавец Аляксандр Янушкевіч. — Адна з квітнеючых тэм у нашай навуковай літаратуры — менавіта гісторыя. Ці можам мы ў такіх асаблівых умовах стварыць самадастатковы рынак інтэлектуальнай кнігі? Адзінае, што нам дазваляе стаць унікальнымі, — гэта беларуская мова, арыентацыя на аўдыторыю, якая хоча развівацца ў інтэлектуальным і культурным плане, адчуваючы сябе беларусамі. Мы яе павінны знаходзіць, выхоўваць і ствараць для яе неабходны прадукт».

«На маё разуменне, інтэлектуал — гэта чалавек, які хоча данесці нейкі мэсэдж, важны для сённяшняга дня, новую інфармацыю, — лічыць доктар філалагічных навук, дацэнт Варшаўскага ўніверсітэта Андрэй Масквін. — У розныя часы гэты былі пісьменнікі, гісторыкі, філосафы, літаратуразнаўцы, культуролагі… З 70-х гадоў мінулага стагоддзя, з развіццём сродкаў камунікацыі, роля інтэлектуалаў звялася да пераказвання відавочных рэчаў. Але сітуацыя краін Усходняй Еўропы крыху іншая, чым у Заходняй. Таму што звядзенне колькасці інтэлектуалаў у грамадстве да нуля — гэта вельмі заходняя тэндэнцыя. А ў нашай рэчаіснасці гістарычна (і цяпер) вельмі патрэбны былі інтэлектуалы. У нашым асяродку яны павінны быць яшчэ інтэлігентамі — людзьмі, якія перадаюць новыя ідэі. Для мяне гэта могуць быць розныя галіны: не толькі філасофія, але і мастацкая літаратура, кінематаграфія, тэатральнае мастацтва, літаратурная крытыка, мастацтвазнаўства і г. д.».

Сапраўды, у наш час, асабліва гледзячы на моладзь эпохі *Digital*, так і карціць аднесці да інтэлектуалаў наогул усіх, хто чытае… Але далей не магу напісаць «хоць штонебудзь». Чытанне бывае сапраўды рознае — не заўсёды добрае і з высокімі думкамі, не заўсёды такое, што ўзнімае чалавека над рэчаіснасцю і дае падставы для думкі. Таму хочацца назіраць за дзейнасцю выдавецтваў, якія выпускаюць навуковыя, энцыклапедычныя, філасофскія кнігі, усведамлючы, што як інтэлектуалы «маюць місію» (Скарыну будуць згадваць яшчэ доўга): і ствараюць «корпус тэкстаў», нават калі незапатрабаваны цяпер, то проста, каб ён быў, што важна для любой культуры, каб былі — і ствараліся пісьменнікамі — кнігі, па якіх можна меркаваць пра ўзровень грамадства і спадзявацца, што колькасць выдадзенага ператворыцца ў якасць прачытанага.

**Марыя АСІПЕНКА**

# Янка Маўр: у дынаміцы і напружаных сітуацыях

У маі споўнілася 135 гадоў з дня нараджэння патрыярха беларускай дзіцячай літаратуры Янкі Маўра. Адразу згадваюцца аповесці «Палескія рабінзоны», «У краіне райскай птушкі», першы прыгодніцкі раман «Амок». Але спадчына пісьменніка — гэта не толькі захапляльная дзіцячая літаратура, яна ўключае і п'есы, і байкі, і публіцыстыку, і вострыя фельетоны. Творы Янкі Маўра друкаваліся ў часопісах «Беларусь», «Маладосць», «Іскры Ільіча», «Полымя рэвалюцыі» і іншых. Вельмі цесна супрацоўнічаў пісьменнік з тыднёвікам «Літаратура і мастацтва». Яго публіцыстычныя артыкулы «БССР і Уругвай», «Сальвадорцы», «У доларавай пятлі», «Абаронцы злачынцаў», «Шэфілд-Варшава», «Прасвятленне мазгоў», «Забавы амерыканскіх хлапцоў» і іншыя рэзка адгукаліся на розныя міжнародныя падзеі. У лісце да Якуба Коласа ад 1 ліпеня 1950 года Янка Маўр пісаў: «ЦК пастанавіла рэарганізаваць "ЛіМ" — выдаваць два разы ў тыдзень, арганізаваць новыя аддзелы, у тым ліку міжнародны аддзел пад кіраўніцтвам Янкі Маўра, адным словам зрабіць газету падобнай да "Литературной газеты". Сабралі нас, інструкціравалі, а потым... Масква адмовіла павялічыць асігнаванне. Нашы хлопцы кажуць, што Трумэн выратаваўся ад бяды, якую яму рыхтаваў Маўр...»

Шмат увагі аддаваў пісьменнік пытанням дзіцячай літаратуры. Ён лічыў, што найважнейшае патрабаванне да дзіцячай кнігі — сюжэтная цікавасць, займальнасць. «Калі кніга для дарослага чытача, — пісаў Я. Маўр, — можа захапіць сваёй глыбінёй і мастацкасцю больш, чым кампазіцыяй і сюжэтнымі ходамі, то для дзіцячага чытача гэтага мала. Яго актыўная натура патрабуе дынамікі, напружанай сітуацыі, эфектыўнай гераікі». На старонках «ЛіМа» Янка Маўр рэзка выступіў супраць аднабаковай крытыкі рамана Івана Мележа «Мінскі напрамак».

«Усё зрабіў тав. Кудраўцаў, — адзначаў Я. Маўр у артыкуле "Ці так трэба падтрымліваць", — каб "дапамагчы" маладому пісьменніку, які выпусціў першы значны твор. Разабраў "па костачках", усё заўважыў, усё ўскрыў. Не захацеў ён толькі аднаго: падтрымаць (без двукоссяў) аўтара ацэнкай таго дадатнага, што ёсць у творы. Не захацеў сказаць, што ўся вялікая калекцыя недахопаў — толькі недаробкі, якія зусім лёгка выправіць, не закранаючы ні сутнасці, ні структуры твора, не захацеў паказаць, у чым не толькі слабасць, але і сіла пісьменніка, не захацеў падтрымаць у ім веру ў сябе...».

Застаўся неапублікаваным вельмі цікавы артыкул Янкі Маўра «Чаму навучыла мяне крытыка», які захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным музеі беларускай літаратуры. Прапануем яго сёння чытачам «Літаратуры і мастацтва».

**Марыя МІЦКЕВІЧ**



*Янка Маўр з унучкай Марыяй (Міцкевіч). 1956 г.*

## Янка МАЎР

# ЧАМУ НАВУЧЫЛА МЯНЕ КРЫТЫКА

Члены рэдакцыйнага савета пры Выдавецтве збіраліся на пасяджанне. Тав. Матузаў хадзіў, трымаючы ў руках кнігу «Вакол свету», зажаўшы палец між нейкімі старонкамі яе. Мы з ім па-сяброўску размаўляем, жартуем. Пад пальцам у яго знаходзіцца крытыка на маю кнігу (крытыка засакрэчана, бо калі-б сакрэт адкрыўся, то прышлося б адмовіцца ад эфектнага выступлення).

Пасяджанне адкрылася. Тав. Матузаў устаў, разгарнуў кнігу, памаўчаў, уздыхнуў і прачытаў: «...з поўдня набліжалася вызваленчае войска гаміндана пад камандай генерала Чан-Кай-шы.»

— Вось, таварышы, што мы друкуем у 1948 годзе. Ды за гэта нас усіх разагнаць трэба... і г.д.

Уражанне было вялікае, у тым ліку і ў мяне. На 32 старонцы сапраўды так было напісана, але пачыналася фраза са слова «Казалі», па сэнсу — «хадзілі ў народзе чуткі». Гэтага слова крытык не чытаў. А далей, на 36 стр. ішоў раздел «Зноў спачатку», дзе пачынаўся паварот апавядання: гаміданаўцы аказаліся такімі самымі, як мукдэнцы, нішто не змянілася, прышлося пачынаць барацьбу «Зноў спачатку», пачалі арганізоўвываць партызанскія атрады «Чырвоных пік» для барацьбы з «вызваліцелямі» (у кнізе гэтае слова пайшло ўжо ў двухкоссях) і г.д.

Але крытык не ведаў гэтага, бо не чытаў апавядання. Рэдакцыйны савет рэабілітыраваў апавяданне, бо я сам мог абараніцца. Але «крытыка» пайшла далей і праз некалькі тыдняў з'явілася ўжо ў перадавой «Літаратурнай газеты». Там пісалася, што Маўр паказвае Чан-Кайшы, як барацьбіта за рэвалюцыю і г.д.

З гэтай крытыкі я мог зрабіць толькі адзін вывад: добра было-б, каб крытыкі чыталі тое, што яны крытыкуюць.

Трывожныя сігналы выклікалі артыкул Войніча ў «ЛіМ»е пад назвай «Чаму могуць навучыць дзяцей такія кнігі». З гэтага артыкулу я даведаўся, што кнігі «Шлях з цемры» і «У краіне райскай птушкі» — напісаны толькі для таго каб прынесці дзецям шкоду. І ніводнага слова пра сутнасць кніг і іх ідэйную накіраванасць. Ніводнай дадатнай рысы не знайшлося ў гэтых кнігах. Нават традыцыйнага заключнага абзаца «Не гледзячы на ўсё гэта»... у артыкуле не было. Замест гэтага была катэгарычная канцоўка — «Яўны брак».

З гэтай крытыкі я мог зрабіць толькі адзін вывад: няма чаго тут выпраўляць, а трэба забыцца на гэтыя кнігі і больш такіх рэчаў не пісаць.

Крытык Зомерфельд напісаў для «Полымя» артыкул з усебаковым разглядам кнігі «Шлях з цемры», артыкул гэты рэдакцыя хацела была надрукаваць, але не адважылася — лепш не ўмешвацца ў гэтую справу.

Я з усёй гэтай крытыкі зрабіў такі вывад: бываюць выпадкі, калі трэба змяшчаць аднабаковую крытыку і не трэба змяшчаць усебаковую.

Мінула каля двух гадоў. Ідзе пленум праўлення ССП. Я сядзеў з сваім прыяцелем Лужаніным. Па-сяброўску гутарым. А ў кішэні ў яго крытыка. Засакрэчаная. Бо калі-б ён сказаў, то прыйшлося-б адразу адкінуць больш за палову яе, і тады не будзе ніякага эфекту ад выступлення. У яго, напрыклад, сказана, што класава — свядомая жывёліна — яшчарка, а ў кнізе гаворыцца пра быка, які заўсёды нападае на галандцаў. У яго (Лужаніна, а не быка) сказана, што галандскі рабочы, былы камуніст, — кіраўнік паўстання, а ў кнізе нават падкрэсліваецца яго другародная роля. У яго, Лужаніна, сказана, што факір у кнізе паказаны як сур'ёзная фігура, а ў кнізе і дзіця бачыць, як высмейваецца гэты факір і г.д. Каб яшчэ больш развянчаць «цуды» факіраў, у кнізе зроблена зноска, з якой відаць, што і мы можам рабіць такія цуды. А Лужанін сцвярджае, што гэтая зноска падымае факіраў на высату, падае ім больш таемнасці. Каб так казаць, трэба ўжо мець пэўнае жаданне бачыць тое, што хочацца. Перш чым адважыцца напісаць, што багатай буржуазіі на Яве амаль няма, мне прышлося пакапацца ў аўтарытэтных матэрыялах. Я і цяпер магу паўтарыць, што на Яве гадаваліся толькі феадалы, а гандлёвай, фінансавай, прамысловай буржуазіі няма, нават дробны гандаль знаходзіцца ў руках кітайцаў і арабаў (прынамсі так было ў тыя часы, аб якіх гаворыцца ў кнізе). А крытык катэгарычна і галаслоўна сцвярджае, што гэта не так. Ці значыць гэта, што ў кнізе хібаў няма? Вядома, не. Я нават не хацеў бы быць такім дасканалым, як машына. І апрача... слоў і сказаў, якія заўважыў Лужанін, знойдзецца, што паправіць.

Хай аўтар потым і абвяргае сабе гэтыя недакладнасці як хоча, а пакуль што пазіцыя крытыка выгаднейшая і ад яго як кажуць «што-небудзь ды застанецца». І ў тых, хто добра не ведае гэтай кнігі, сёе-тое засталося.

А якую карысць атрымаў аўтар ад гэтай крытыкі? Пакуль што я згодзен, што можна было-б лепш сказаць пра майстра на караблі, чым тоё, што ён «ходзіць, пастуквае ды папраўляе». Знойдзецца і яшчэ што-небудзь падобнае. А па іншых заўвагах я магу ўступіць у публічную дыскусію і даказаць, што яны неправільныя, але трыбуны такой ужо няма.

І зноў я ўбачыў тую самую спецыфічную крытыку. Бярэцца кніга, аловак, папера: а ну паглядзім, колькі тут знойдзецца агрэхаў! І пачынаюцца пошукі, у словах, сказах, незалежна ад зместу, сутнасці, нават тэксту твора. Ага! У загалоўку слова «класава-свядомая» жывёліна, а далей гаворыцца пра яшчарку, — значыць, яна. А ўсё чытаць няма патрэбы. Паміж іншым, незалежна ад гэтага, я лічу што лепш сказаць проста «свядомая» жывёліна.

Такім чынам уся глыбокая, прынцыповая крытыка зводзіцца да ўдасканалення некалькіх сказаў.

А між тым у кнізе, якой карыстаўся Лужанін, ёсць такія мясціны, якія патрабуюць папраўак па сутнасці. Крытык іх не заўважыў. Я іх выправіў для новага выдання.

Мне, як і кожнаму пісьменніку, у гутарцы з рэдактарамі і таварышамі прыходзіцца чуць шмат каштоўных, дзелавых заўваг, і такія заўвагі сапраўды карысныя, на іх, здаецца, ніхто не крыўдзіцца.

А эстрадная крытыка мае на ўвазе зусім другое. Ці нельга было-б зрабіць так, каб крытыка на трыбуне была-б такая самая, як рэдактарская крытыка? Я ўпэўнены, што сам Лужанін, як рэдактар, згадзіўся-б адкінуць няслушныя заўвагі, не абыгрываў-бы дробязі і даў-бы каштоўныя заўвагі. І ніякага непаразумення не было-б, і ніхто не сказаў-бы, што аўтар балюча рэагуе на крытыку.

А на трыбуне большай часткай адбору не робіцца, каштоўныя заўвагі абрастаюць і дробязямі, і перагібамі, і зусім няправільнымі, калі не сказаць болей, сцвярджэннямі.

11 красавіка, 1950.

# Растрывожаныя майскія строфы

## РАЎНАВАЦЬ ДА РЫФМЫ

Раман **Уладзіміра Гаўрыловіча «Сэрца сваё не падманеш»**, які друкаваўся ў №№ 4 і 5 «Полымя», натхняе на розныя развагі. Вядома, выклікае павагу жаданне аўтара звярнуцца да тэмы, якая цяпер рэдка гучыць у літаратуры, — перадваеннае і акупацыйнае жыццё беларускай вёскі. Пісьменнік імкнуўся да падрабязнага, дакладнага ўзнаўлення тагачасных рэалій, узбагачаючы іх каларытным дыялектным маўленнем герояў. Аднак падчас чытання пастаянна ўзнікала ўражанне, што перад вачыма твор не XXI стагоддзя: сюжэтна-тэматычны водгалас ваеннай прозы, створанай нашымі папярэднікамі, выразна адчуваецца ў рамане.

Працягвае асэнсаванне ваеннай тэмы **Мікола Мятліцкі** ў нізцы вершаў **«Сонтрава»**. З болем і ўдзячнасцю паэт згадвае і сваіх родных, блізкіх людзей, і зусім далёкіх і незнаёмых — усіх, каму давялося прайсці праз пякельныя дарогі тых падзей. Ёсць у нізцы і іншыя матывы: вясна выступае як кантрастнае палатно і схіляе не да настальгічных успамінаў пра свае далёкія вёсны і не да летуценнага захаплення маладосцю, а — да падсумавання жыццёва-паэтычнага досведу. Для сапраўднага паэта гэтыя сферы непадзельныя.

А таму няма сэнсу «раўнаваць да рыфмы». Пераканаемся ў гэтым і пазнаёміўшыся з новымі вершамі **Алеся Емяльянава-Шыловіча**, дзе ён дзеліцца надзвычай інтымнымі перажываннямі: лірычны герой вельмі натуралістычна апісвае ўражанні ад назірання за нараджэннем свайго дзіцяці:

*памятаю бляўотную фарбу на сценах бальніцы*
*памятаю як рассякалі губу нажніцы*
*памятаю цябе на каталцы з бялёсым як крэйда тварам*
*памятаю выбухі ад напругі лопнулых капіляраў*

Каханне, якое жыве не на аблоках, а пад коўдрай на старой утульнай канапе і якое ўратуе, нават «калі заўтра патоп». А час будаваць каўчэг «з пачуццяў і словаў» ужо надышоў, прамаўляе паэт.

І вось нарэшце — у вершах **Іны Фраловай** — мы пачуем і голас вясны (якая, праўда, усё адно непазбежна азіраецца на восень ці прынамсі прадчувае яе надыход).

*Прачнуўся май. Бэз ап'яняе пахам.*
*Прачнуўся май у росквіце вясны.*
*Над белаю зямлёю белым птахам*
*Ляціць у свет, мае трывожыць сны.*

Вясновыя мелодыі ў паэтэсы гучаць па-багдановічаўску класічна, ураўнаважана-рамантычна. Тонкая лірыка, пяшчотныя майскія мелодыі ў вершах пра каханне і адначасова пранізлівы боль, скрушнае адчуванне незваротнасці ў вершах пра вайну. Калі, напрыклад, радкі М. Мятліцкага запамінаюцца найперш публіцыстычнай завостранасцю, то І. Фралова выказваецца на тую ж тэму зусім па-іншаму: кранальна, чуллівa, на мяжы адчайнага крыку і сцішанай роспачы.

Даследчыкі гісторыі беларускай літаратуры і прыхільнікі творчасці Янкі Маўра, безумоўна, звернуць увагу на публікацыю ўрыўка з рамана «Дзяўчына-маці». Твор гэты, праца над якім вялася ў 1946—1947 гг., застаўся часткай ненадрукаванай спадчыны пісьменніка, рукапіс захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Чытачы «Полымя» маюць унікальную магчымасць першымі пазнаёміцца з гэтым творам. Падрыхтоўка тэксту — **Марыі Міцкевіч**.

## ФІЛАСОФІЯ ЖЫЦЦЯ

Новая аповесць **Сяргея Трахімёнка «Бог любіць Адэсу»** — для тых, хто аддае перавагу шпіёнскім прыгодам, складаным загадкам, філасофскаму падыходу да жыцця і, вядома ж, любіць Адэсу. Сюжэтныя інтрыгі і своеасаблівае культуралагічнае настальжы па тым, чаго ўжо няма, так арганічна перанітоўваюцца ў апавядальнай канве, што ў чытача ёсць час і задумацца над ходам сусветнай гісторыі, і над сэнсам уласнага жыцця, і папросту атрымаць асалоду ад мастацкага ўвасаблення задумы. Уважлівы чытач будзе ўзнагароджаны: на апошніх старонках аповесці аўтар раскрывае галоўны сакрэт легендарнага горада.

Філасофіі — жыцця, кахання, лёсу — у гэтым нумары часопіса ўвогуле шмат. Аповесць **Максіма Іванова «Прывід фугі»**, якая складаецца з чатырох жыццёвых гісторый, таксама натхняе на развагі ўсіх, хто ляціць у прорву «з хуткасцю жыцця» і не знаходзіць часу спыніцца, сарыентавацца ва ўласных прыярытэтах. Пісьменнік прамаўляе ад імя розных людзей з розным узроўнем сваёй асабістай катастрофы (для некага гэта трагічная смерць блізкіх людзей, а для некага — страта жадання працягваць бясплённае існаванне ў свеце згубленых сэнсаў). Гэта і ёсць агульная апавядальная мелодыя ў сюжэтным шматгалоссі, што падкрэсліваецца і ў назве твора.

Трапляе ў агульную філасофскую танальнасць і апавяданне **Эльвіры Вашкевіч «Чатыры жыцці Боранькі Элентоха»**. Крыху дасціпнага гумару, стрыманасць у апісанні пачуццяў і эмоцый, павага да продкаў, вера ў людзей і сапраўднае каханне, а напрыканцы — невялічкая інтрыга, надзейна прыхаваная ў чамаданчыку, які галоўны герой вывез з разбуранага Берліна. Твор з класічнай пабудовай сюжэта будзе даспадобы аматарам спакойнага чытання.

А ўвогуле трагічная філасофія жыцця вельмі простая і, як гэта ўдала паказаў **Уладзімір Карызна** (нізка «Вновь надеждой повеет», пераклад А.Цяўлоўскага), можа змясціцца ў пяці радках:

*Простая философия*
*Речка бьётся о берег,*
*Да взобраться не может, —*
*Разрушает тот берег —*
*И мелеет сама.*

## ФАБРЫКІ ПАЧУЦЦЯЎ

Нарэшце вельмі востра абмеркаванне мэтазгоднасці і бяспечнасці медыцынскіх прышчэпак са старонак газет і сацыяльных сетак перабралася ў прастору мастацкіх тэкстаў. **Вераніка Ляўчук** прадстаўляе нам **«Фабрыку Віта Брэвіс»**, на якой вырабляюць тыя самыя прышчэпкі. І тут не ўсё так гладка: лічыцца, што прышчэпкі фабрыкі спыняюць развіццё таленту. Таму ёсць два варыянты: або дзіця здаровае, або дзіця таленавітае. Тэма апавядання, безумоўна, гучыць правакацыйна і прыцягвае ўвагу.

І пакуль удзельнікі праекта «10 + 10» дзеляцца сваімі марамі пра Мінск (часта, праўда, даволі знешнімі, «касметычнымі»), **Маргарыта Латышкевіч** завабліваe нас у далёкую мінуўшчыну: героі аповесці **«Вараціш-гара»** змагаюцца з цмокамі і сябруюць з ваўкалакамі. Аповесць чытаецца цікава, нягледзячы на тое, што аўтарка рызыкнула звярнуцца да тэмы, некалі вельмі папулярнай у айчыннай літаратуры, сюжэтных паўтораў мы тут не сустрэнем. Удалая гістарычная стылізацыя, у тым ліку і на ўзроўні лексікі (а гэта ад такой маладой пісьменніцы — найвышэйшае майстэрства!) стварае эфект поўнага паглыблення ў рэальнасць гістарычнага фэнтэзі.

У паэтычных падборках часопіса гучыць суладдзе вязладдзя: **Ч.ыЖ**, **Кірыл Мяцеліца**, **Адам Шостак** ствараюць вершы з яркіх, але дэструктыўных успамінаў дзяцінства і артэфактаў сучаснасці, якія трапляюць на вока штодзень па дарозе на працу, дадому, на вакзал, у парк… З гэтых стракатых малюнкаў рыфма не складваецца, ды ці бясспрэчная каштоўнасць верша ў наяўнасці рыфмы? Вядома, не. Але і найпадрабязнейшае апісанне сваіх асабістых перажыванняў, уражанняў ад сузірання твораў мастацтва і падарожжаў у іншыя краіны альбо прастадушнае выказванне жаданняў таксама паэзію не робяць.

**Жана КАПУСТА**

# МРОІ БАГІНІ ІШТАР

На старонках майскага «Полымя» змешчана апавяданне Таццяны Будовіч-Барадулі «Прыступкі». Арыгінальнае і прафесійна створанае (у лепшым сэнсе апошняга слова). Але…

Тут я рызыкну выказаць некалькі… не заўваг нават, а парад. А хутчэй, проста разважанняў наконт таго, што б я змяніў у творы, калі б ён быў маім.

Пачну з самага пачатку, дакладней, з самай першай фразы апавядання «Прыступкі».

*«Дзякаваць богу, што не ў сярэднявеччы нарадзілася, — паспытала б на сабе ўсе прыдумкі тагачасных інквізітараў, — з жахам думала Тэці, разглядаючы страшныя малюнкі ў нядаўна купленай кнізе пра ведзьмаў».*

Чаму я прывёў цалкам гэтую фразу? Ды па адной толькі прычыне: гэта, па словах Чэхава, «тая стрэльба» з першага акта п'есы, якая абавязкова павінна стрэліць у трэцім акце, раз ужо яна «вісіць на сцяне». А яна, на мой погляд, не «стрэліла», а проста знікла ў нікуды. Лічу, такі пачатак павінен быць у далейшым неяк развіты: тое незвычайнае і нават міфічнае, што адбылося потым з галоўнай гераіняй, павінна было мець пад сабой асновай менавіта мясцовую міфалогію (з тымі ж ведзьмамі, напрыклад, раз ужо Тэці пра гэта падумала), а не шумера-акадскую.

Але чым больш будзённа і рэальна развіваліся б папярэднія падзеі, тым эфектней выглядаў бы нечаканы пераход да незвычайнага (містычнага, фантастычнага, нерэальнага). А ў апавяданні «Прыступкі» доўгі падрыхтоўчы перыяд, да таго ж у многім, лічу, «прыцягнуты за вушы».

Незразумелае кафэ, потым яшчэ больш незразумелае памяшканне са скляпеннем. Міжволі настройваешся на нешта вельмі незвычайнае (і нечаканае!), а тут — р-а-а-з! Паслізнулася, упала, выцялася скронню… Дзеля гэтага можна было не выбудоўваць такі доўгі ланцужок (кафэ — дзіўны афіцыянт — візітоўка — памяшканне — нейкая дзяўчына, якая ў яго ўвайшла, — таямнічая лесвіца ўніз). І ўсё гэта толькі дзеля таго, каб паслізнуцца і бразнуцца? Ды такое і на паверхні магло адбыцца!

Галоўныя героі (і Тэці, і Дамінік) спецыялісты па Шумеру. Але ж у кафэ яны аказаліся як простыя наведвальнікі, ды і далей іх «шумерская» спецыялізацыя не спрацоўвае. Іншая справа, калі б, напрыклад, Дамінік зрабіў нечаканае адкрыццё, расшыфраваў старажытны артэфакт і пад сакрэтам расказаў пра гэта Тэці, а потым яны разам нешта зрабілі з гэтым артэфактам... Вось тут і пачалося б нерэальнае развіццё падзей. І не спатрэбіўся б «ланцужок», які загадзя падрыхтоўвае чытача да незвычайнага, а ўсё заканчваецца простым падзеннем.

І яшчэ аб адной «стрэльбе», якая таксама «вісела на сцяне», але так і не стрэліла. Я маю на ўвазе *«тыпа перад ноўтбукам за супрацьлеглым столікам»*.

Ну, няхай сабе ён проста сядзеў, калі галоўныя героі ўвайшлі ў кафэ. Але навошта тады такія далейшыя радкі?

*«…тып перад ноўтбукам за супрацьлеглым столікам неўразумела павярнуў голаў у іх бок. Абсалютна лысы чэрап, невыразны твар, толькі вочы бліснулі злавеснымі агеньчыкамі, перш чым зноў утаропіцца ў экран».*

Зноўку міжволі чакаеш, што пасля такой разгорнутай характарыстыкі гэты тып проста абавязаны неяк праявіць сябе ў далейшым. А ён проста знікае!

Усё астатняе ў апавяданні цалкам лагічна. Выбар, які павінна зрабіць галоўная гераіня, ахвяруючы альбо Дамінікам, альбо Эдвардам, перагукаецца з выбарам багіні Інаны-Іштар, якая аддала дэманам Думузі, а не Энкімду. Нават імёны ў нечым сугучныя: Думузі — Дамінік і Энкімду — Эдвард. Невялікае па памеры апавяданне можа быць завязкай для больш маштабных падзей з удзелам тых самых галоўных герояў (якія, зразумела, застаюцца жывымі: Тэці вярнулася з «таго свету», каб здзейсніць прадказанне, Дамініка — «выцягнуць» найноўшыя медыкаменты: валадарка Царства памерлых паабяцала яго адпусціць, а Эдварда ўвогуле не закранулі ніякія непрыемнасці і пагрозы жыцця). Пра ўсё гэта, хочацца верыць, у недалёкай будучыні Т. Будовіч-Барадуля напіша раман альбо прыгодніцкую аповесць.

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

# ЯК ПРЫРУЧЫЦЬ СНЕЖНУЮ КАРАЛЕВУ?

Яго новая кніга носіць па-вангагаўску летнюю назву «Сланечнік» («Чатыры чвэрці», 2018), але ў сваёй творчасці ён больш за ўсё любіць зіму, якой надае (ці не адзіны з беларускіх паэтаў) рамантычна-любоўнае гучанне. «Завірухі» ў паэта, «як жанчыны, / Узбіваюць каля хат / Гурбаў белыя пярыны». Звычайная сняжынка, якая заляцела ў акно, на працягу ўсяго года «...праменіцца, не растае з бласлаўёнай хвіліны тае...», бо з'яўляецца сімвалам кахання да таямнічай незнаёмкі. А «завеі» — гэта «белыя лебедзі — / Крыллем лапочуць у садзе...»

Настраёва яму блізкая нервовая лірыка Валерыя Маракова і Тодара Кляшторнага.

Натхніўшыся заклікам «Пайсці б у ноч, / Пайсці б далінай, / Пайсці чорт ведама куды...» (Т. Кляшторны «Кляновыя завеі»), паэт з'язджае на два гады пілаваць лес у Карэліі. Менавіта сустрэча з гэтым краем надала яго творчасці тую эстэтычную і тэматычную адметнасць, якой, скажам, пачаў вызначацца жывапіс Гагена, калі той з'ехаў на акіянічныя астравы.

Першыя кнігі героя нашага артыкула — паэта Міколы Маляўкі ўражвалі небеларускай энергетыкай, унутранай сілай. Калі чытаеш яго зборнікі, то пачынаеш разумець, што сапраўдны паэт павінен быць не толькі тонкім лірыкам, але і фізічна моцным, незалежным, смелым дзецюком, што гатовы да нечаканага спаткання як з мядзведзямі і ваўкамі, так і з таемнай, містычнай зімовай феяй, своеасаблівай Снежнай Каралевай, якая можа зрабіць цябе самым шчаслівым мужчынам на свеце ці ператварыць у лядзяш.

Сама зіма, паводле Маляўкі, — яскравая метафара незвычайнага кахання, вострай, да гэтага не адчутай, эратычнай эмоцыі, якую не зможа даць ніводная іншая пара года:

*Апошні снег.*
*Яго запомні*
*На маладой траве пад плотам.*
*Ні дождж, ні сонечныя промні*
*Сняжынак не заменяць потым.*
*Не гавары, што ўлетку спёка,*
*А ўвосень капае са стрэх —*
*На дне душы тваёй, глыбока,*
*Ён будзе жыць,*
*Апошні снег.*

Снег можа схаваць цябе ад чужых вачэй, з яго можаш пабудаваць палац кахання, які не павінен крануць ні здрадніцкія промні вясны, ні тым больш спапяляльнае знішчальна-камарынае лета. Дарэчы, лету паэт прысвяціў такія жартаўліва-здзеклівыя радкі: «...так згаладаўся па леце — / Рад камарам. / Лёг бы, здаецца, без майкі / Там, дзе іх болей, у цень. / Хай бы абсыпалі макам — / Спаў бы сабе, / Як цюлень».

Растаць жа гэты палац павінен толькі ад выратоўчай энергіі сексу: «Цнатліва-пудкія, як тайна, / Акругляцца цвярдзей — / І зноў ад губ маіх адтаюць / Узгорачкі грудзей».

Паэт верыць у каханне, менавіта калі яно набывае містычна-зімовае, казачнае адценне, бо іначай, з наступленнем цвяроза-рэальнай вясны з яе заўсёдным брудам ці згаданага ўжо лета, што працінае цябе камарынымі ўкусамі, таемная каханка можа ператварыцца ў звычайную ведзьму:

*Чаруе надзвычай*
*Усмешкаю мілай,*
*Нібы таямнічай*
*Валодае сілай. /.../*

*За шлюбнаю брамаю*
*Чары аслабнуць —*
*І стане таксама*
*Раўніваю бабаю.*

Як тут не згадаць страх перад жаніцьбай у Валерыя Маракова, які літаральна проста чырванеў ад злосці, калі ў яго пыталі, чаму ён халасты: «Што вы, хлопцы?! Хочаце звязаць мяне па руках і нагах? Хочаце, каб з паэта я ператварыўся ў няньку? /.../ Што з таго, што Алесь Дудар ажаніўся? Не паспеў ён вымушана пакінуць на нейкі час Менск, як ягоная Наташа перамахнула да Алеся Звонака...»

Думаю, Маракоў ацаніў бы такі вясёлы вершык свайго духоўнага вучня:

*Кот перабраўся*
*Жыць да кошкі.*
*Думаў, ад'есца,*
*Выспіцца трошкі.*

*Месяц мядовы,*
*Зноў жа, а ў кошкі*
*Ложак шлюбны —*
*Голыя дошкі.*

*Кот апусціўся,*
*Высах, як хворы.*
*П'е самагонку,*
*Есць памідоры...*

У сваёй новай кнізе «Сланечнік» паэт ізноў здзіўляе. Пасля казачна-зімовай эротыкі, іранічных назіранняў за рэальнасцю, вострых і нечаканых у сваёй вобразнасці зборнікаў гэтае выданне ўражвае непрыхаванай павучальнасцю. Тут сабраны вершы, прасякнутыя выключна патрыятычным і высокадухоўным зместам: «Вялікі свет, а Беларусь адна», «Родная мова», «Захоўвайце матчыны казкі і песні», «Радаводнае дрэва», «Чытаю Біблію», «Храм», «9 Мая, Дзень Перамогі» — адзін толькі пералік назваў сведчыць, якога кшталту паэзія тут пераважае. Узнікае адчуванне, што сённяшні Мікола Маляўка пакінуў свае захапленні Валерыем Мараковым і Тодарам Кляшторным у далёкім мінулым, а цяпер натхняецца эстэтыкай павучанняў і прыпавесцяў Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны альбо Сімяона Полацкага.

Што ж, таксама някепска. Тут, вядома, адчуваецца свой стыль і пэўная адметнасць. Але... Хто ведае, можа, у гэту гарачую летнюю ноч у пакой да паэта ізноў заляціць містычная сняжынка, ператворыцца ў чароўны карабель, які дамчыць яго да каханай... Снежнай Каралевы, якую ён пакінуў дзесь у нетрах казачнай Карэліі. І паэт успомніць, што:

*Паэзія начэй —*
*Не тоўсты том,*
*А тоненькая кніжка...*

Ён ізноў пачне «пальцы твае прыручаць нясмела, як птушанят», абдыме сваю каханую «каб аж костачкі хруснулі»... А мы будзем зайздросціць, бо не маем такой жа сілы, упэўненасці ды імпэту, каб пакахаць гэту таемна-няўлоўную, капрызлівую і такую жаданую Снежную Каралеву.

**Васіль ДРАНЬКО-МАЙСЮК**

# Сатырычным пяром — па заганах і хібах

**Творцаў, якія на высокім мастацкім узроўні працавалі б у галіне гумарыстычна-сатырычнай літаратуры, звычайна няшмат. Такая літаратура, з аднаго боку, традыцыйна лічылася нібыта другараднай, несур'ёзнай, з-за чаго да яе звярталіся нямногія таленавітыя аўтары, а з другога — вымагала ад пісьменніка адмысловага і рэдкага дару — бачыць сапраўды смешнае ў найчасцей нясмешным жыцці.**

Адзін з сучасных айчынных творцаў, які валодае гэтым дарам, — вядомы пісьменнік-сатырык Янусь Малец, які здаўна працуе ў розных жанрах сатыры і гумару. І паспеў выпусціць не менш чым паўтузіна аўтарскіх зборнікаў. На працягу амаль чвэрці стагоддзя ён піша як гумарыстычна-сатырычныя вершы, пародыі, так і адпаведныя празаічыя творы. Вось і ў новай сваёй кнізе «Галава — не вядро, альбо ё-маё!» (Мінск, «Чатыры чвэрці», 2018) ён выдатна праявіў свой талент сатырыка, жартаўніка, перасмешніка, пра што сведчаць змешчаныя тут гумарэскі і гісторыйкі, фельетоны, бываліцы і небываліцы, разнастайныя карацелькі. З ліку апошніх — шматлікія творы, напісаныя ў такіх арыгінальных жанрах, як «Януселькі-карацелькі», «літарадурныя памыйкі», «абрэвіятуркі».

Творы храналагічна ахопліваюць падзеі, што адбываліся ў розных мясцінах Беларусі на працягу чвэрці стагоддзя — з пачатку 1990-х гадоў да нашых дзён. Тэматыка вельмі шырокая: сацыяльныя і сямейныя праблемы, людскія заганы. Аўтар зборніка мае багаты жыццёвы досвед, ведае грамадскае жыццё-быццё, разбіраецца ў супярэчнасцях сацыяльнага развіцця і асаблівасцях чалавечай псіхалогіі.

Пры чытанні ловіш сябе на думцы, што найлепш запамінаюцца трапныя іранічна-сатырычныя афарызмы (часам нават рыфмаваныя!), якія ахопліваюць практычна ўсё тэматычна-сюжэтнае поле кнігі. З ліку найбольш удалых — наступныя: «Бізнес — гэта шлях ці на нары, ці на Канары»; «Рабочы! Не завіхайся каля станка — цябе яшчэ чакае дача»; «Мінздраў папярэджвае: не вывучайце

цэннікі ў магазінах без валідолу!»; «Новы "венік" іншы раз мяце па-старому, а зарплату атрымлівае па-новаму»; «Вадзіцель! Зрабі правільны выбар паміж жыццём і каленам спакуслівай пасажыркі».

Дарэчы, нямала твораў у кнізе прысвечаны, тэме любові і кахання ў іх розных «абліччах», прычым часам не надта сур'ёзных (напрыклад, неадольная цяга да чаркі і выпіўкі). Тут ёсць не толькі рэальнае, але і напаўфантастычнае каханне, ёсць і «любоў» да грошай і хабару, і, вядома, бязмежная любоў асобных герояў да саміх сябе. Аўтар неаднойчы закранае (часам у іранічным ключы) праблему прыгожага пісьменства ў сённяшнім прагматычным свеце і акрэслівае ролю мастака ў сучасным літаратурным працэсе. З непрыхаваным сарказмам апісвае светаўспрыманне і тыповыя паводзіны сённяшніх графаманаў, якія, на яго думку, цвёрдакаменна ўпэўнены ў дасканаласці і бязгрэшнасці сваіх твораў і ў той жа час у грахоўнасці тых людзей, якія іх не друкуюць.

Аўтар прадстаўляе нам цэлую галерэю разнастайных персанажаў (ад дзяцей да пажылых людзей), звычайна даючы ім лаканічна-ёмістыя характарыстыкі. Пісьменніку практычна заўсёды ўдаецца дасціпна прапісаць дыялогі, ён нават прадстаўляе на суд чытача т. зв. «трыялог». Менавіта гэтым словам называецца адна гумарэска, у якой прыводзіцца досыць забаўная размова пацыента паліклінікі з доктарам-жанчынай, якая ў сваю чаргу паралельна яшчэ размаўляе з медсястрой на банальную побытавую тэму набыцця абутку ў мясцовым ЦУМе. У выніку такой спецыфічнай размовы

> *Пры чытанні ловіш сябе на думцы, што найлепш запамінаюцца трапныя іранічна-сатырычныя афарызмы (часам нават рыфмаваныя!), якія ахопліваюць практычна ўсё тэматычна-сюжэтнае поле кнігі.*

трох асоб адразу ствараецца камічны эфект, паколькі пацыент не разумее, да каго ж у канкрэтны момант звяртаецца ўрач.

У кнізе абсалютная большасць твораў мае цалкам рэалістычны змест, але зрэдку сустракаюцца і такія, якія больш падобныя на своеасаблівую жартоўна-гумарыстычную фантастыку. Бадай, самым яркім і арыгінальным з такіх твораў з'яўляецца гумарэска «Зямное каханне» (мае аўтарскі падзагаловак «амаль фантастычная прыгода»), у якой апавядаецца пра начную сустрэчу і размову не зусім цвярозага героя — маёра-міліцыянта — з... іншапланецянкай, якая выплыла з нейкага неапазнанага лятальнага аб'екта і паспрабавала спакусіць гэтага небараку.

Як і практычна любы мастацкі твор, кніга мае пэўныя недахопы. Прыкладам, асобныя досыць навязлівыя (сама)паўторы ў тэмах, думках, матывах і персанажах — асабліва тады, калі аўтар падрабязна і ледзь не са смакаваннем шматкроць апавядае як пра выхадкі асобных алкаголікаў, так і ў цэлым пра п'янства дома і на працы, падчас адпачынку. Акрамя таго, у выданні сустракаюцца і ўзоры, гаворачы словамі з адной гісторыйкі, «пласкаватага гумару», якія не выклікаюць усмешкі і ўвогуле нічога не даюць ні розуму, ні сэрцу. Але ж у цэлым кніга атрымалася. Яна прыцягне ўвагу чытача, схільнага да вясёлага ўспрымання навакольнага асяроддзя і ўнутранага свету асобы. Пры чытанні зборніка міжволі складваецца ўражанне, што пісьменнік спрабуе адначасова быць як уважлівым дыягностам розных сацыяльных хвароб, так і клапатлівым лекарам народнай і чалавечай душы. У аўтара вострый зрок, гарачае сэрца і лёгкае пяро.

**Эдуард ДУБЯНЕЦКІ**

Сяргей ДАВІДОВІЧ

## Малая радзіма

**(урывак з паэмы)**

*...І ўсё ж скруціўся ў іншы бок*
*Далейшы лёс хлапечы,*
*Яны, абставіны жыцця,*
*Мяняюць лёс і нас.*
*Не могуць мары векаваць*
*Каля бацькоў на печы —*
*Юнак пакінуў родны дом,*
*Вяскоўцаў і калгас.*

*Дарогі клікалі яго,*
*Як тыя з хаты крокі,*
*Калі ён з маці ўпершыню*
*Ступіў малым на двор.*
*Цяпер адкрыўся перад ім*
*Жыцця абшар шырокі*
*І новых мараў далягляд,*
*І дзейнасці прастор.*

*Не, ён не здрадзіў ні сабе,*
*Ні дням юнацкім чыстым,*
*І мары першыя з душы*
*Не выкінуты вон.*
*Ён зразумеў, што Беларусі*
*Будзе больш карысным,*
*Дзе новых спраў складаўся гімн,*
*Дзе больш патрэбны ён.*
*Але імкнецца ў родны кут*
*Заўжды душа жывая,*
*У незаможны час, які*
*Ўявіць хто б сёння мог?*
*Хто сэрца да канца жыцця*
*Адтуль не адпускае?*
*Для ратавання душаў хто*
*Бацькоўскі кут бярог?*

*Мы свята верым у дабро,*
*У творчых планаў справы,*
*Хоць сустракаюцца ў жыцці*
*Праблемы табалой.*
*Душу і працу аддаём*
*Мы на карысць дзяржавы,*
*А сэрцам — сэрцам мы з табой.*
*З радзімаю малой.*

*І хто назваў цябе «малой» —*
*Святло і святасць лёсу?*
*Ці ж ёсць штось большае для нас,*
*Чым па табе ўспамін?*
*У светлай шчырасці тваёй*
*Квітнелі нашы вёсны,*
*І кожны да цябе ляціць,*
*Нібы да маці сын.*

*Ніколі для жывой душы*
*Не сціхнуць часу хвалі,*
*І ад малой радзімы нас*
*Не адгародзіць час,*
*Бо з ёю гаравалі мы*
*І разам святкавалі —*
*І гэта аб'яднала нас*
*І парадніла нас.*

## Конкурс «ПЕРШАЦВЕТ»

Янка КАЛІНОЎСКІ

Янка Каліноўскі вучыцца ў сталічнай гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны. Няўрымслівы, дапытлівы характар штурхае маладога творцу на розныя эксперыменты з літаратурай і пошукі. У паэзіі галоўнае, па яго словах, — шчырасць, раптоўнасць, нечаканасць.

***

*сказалі «напішы пра Беларусь».*
*я не бяруся*
*адкрываць Амерыку*
*(Караткевічаву, што «пад Оршай»):*
*большасць*
*слоў пяшчоты ўжо даўно*
*сказана.*
*ужо апетыя раны,*
*што пакінула на нашым сэрцы*
*бязлітасная гісторыя.*
*ужо не раз пісалі пра*
*нашыя «моры»,*
*што геаграфічна правільна*
*назваць азёрамі.*
*але каму патрэбна тая правільнасць,*
*тая змушаная выкшталцонасць,*
*калі ўся маёмасць*
*маёй любай краіны —*
*прабітае сэрца і Вольная Воля?!*
*на долю*
*не наракаць.*
*адагнаць*
*прэч*
*сумневы.*
*удалеч адышлі*
*тужлівыя спевы*
*Нашае Нівы і Долі —*
*прыйшлі часы Нашае Ролі,*
*што ўзрушыць сумную публіку!*
*Беларусь для мяне — не рэспубліка*
*ў цэнтры Еўропы*
*(хай сабе і ганаровае званне) —*
*Беларусь — куточак пяшчоты*
*ў цэнтры майго існавання.*
*хто бачыў золак світання*
*над стомленым ранішнім Мінскам,*
*хто прыслухоўваўся да звону Нямігі*
*і паляваў з раз'юшаным Стахам,*
*той, вядома, без страху*
*кінецца ў абдымкі радзімы —*
*маленькай,*
*адзінай*
*такой у свеце,*
*што цьмяна свеціць*
*агнямі паўстанняў;*
*дзе ад рання да рання*
*чуваць жалобныя стогны*
*Плачкі.*
*ніякі сякач*
*не здольны адсекчы ў мяне*
*любоў да Беларусі.*
*я не бяруся,*
*крый божа, не бяруся*
*пераўзысці Купалу ці Коласа,*
*аднак у голасе*
*маім заўсёды будзе ці то туга,*
*ці то яскравае захапленне радзімай —*
*і мой голас такі не адзіны,*
*проста яна — Беларусь — адзіная.*
*дык што яшчэ можна дадаць?*
*хіба спаборнічаць у красамоўстве...*
*але з часоў літоўскіх*
*колькі такіх было,*
*закаханых у нашу краіну.*
*пішаш — як па полі мінным.*
*Штохвілінна,*
*шторадкова*
*выбухае ў розуме (магліва, у сэрцы)*
*шчымлівы вобраз ці ўспамін,*
*і ты адзін,*
*сам-насам з краінай.*
*сам-насам з выбітнымі асобамі,*
*што раз за разам*
*(не без прыгодаў)*
*ратавалі ад смерці радзіму.*
*сам-насам*
*з ціхай плынню прыроды*
*(і думак),*
*што ратунку шукаюць*
*на ўлонні мілай Бацькаўшчыны.*

*сам насам*
*з уласным сумленнем.*

*трымценне*
*ахоплівае,*
*калі ўяўляю, што яе страчу.*
*ды не, ніякі ж кат*
*не адсячэ ў мяне Беларусь...*

*я яе люблю*
*я ёй ганаруся (не гучна, не ўголас на парадах) —*
*а прыслухоўваючыся да мудрых парадаў,*
*навеяных слаўнай мінуўшчынай.*

*Божа,*
*калі ты ёсць,*
*захавай Беларушчыну.*

## Геаметрычныя стасункі

*акальцаваныя МКАДам*
*замкнёныя ў трохкутніку*
*найбуйнейшых раёнаў*
*мы застаёмся дзвюма кропкамі*
*заўсёды звязанымі.*
*гэта нашая простая геаметрыя*
*па ёй вывучаецца шчасце.*
*ісці насустрач сонцу і ветру*
*вычэрчваючы новыя дыяганалі;*
*адлегласць вымяраецца не метрамі*
*а промнямі вечаровай пяшчоты.*
*нашым кропкам не спазнаць адзіноты —*
*яны заўсёды звязаныя*
*цеплынёй бясконцае простай,*
*што, парушаючы ўсе тэарэмы,*
*дапамагае забыць, хто мы і дзе мы;*
*выводзіць на калязямную арбіту МКАД*
*дзе мы не падпарадкоўваемся геаметрыі*
*дзе сіметрыя*
*і раўнавага*
*заўсёды звязаных кропак.*

***

*кожную ноч*
*я пакідаю інтэрнэт уключаным*
*і гучнасць*
*апавяшчэнняў стаўлю*
*на максімум*
*бо раптам*
*ты штосьці напішаш*
*але кожную раніцу*
*я бачу толькі*
*што батарэйка амаль разраджана*
*як і я*
*напэўна, час перастаць чакаць*
*і выключыць перадачу даных*
*вярнуць табе скрадзены*
*маім чаканнем час*
*бо ад нас*
*засталося толькі*
*н*
*нічога*
*засынаю*
*тэлефон падае на падлогу*
*гэта ўжо няважна*
*бо навошта ён мне*
*без гутарак з табой.*

Станіслаў ВАЛОДЗЬКА

## Да стагоддзя Латвіі*

*Ўсе разам вышывалі мы ручнік.*
*Хто да таго меў гонар*
*прычыніцца —*
*Унесці сваю лепту — залатнік, —*
*Укладваў у яго душы часцінку.*

*На ручніку — імёны гарадоў*
*Латвійскіх, дзе нам жыць*
*наканавана.*
*На ім — бель снегу з квеценню садоў*
*І чырвань летніх зор, кастроў на Івана.*

*У ім збіральны вобраз ручнікоў,*
*Якіх у нашым побыце багата,*
*Што прыплылі з далечыні вякоў*
*І аздабляюць нашы будні й святы.*

*Ў сяброўскім коле-карагодзе мы,*
*Святкуючы, за рукі узяліся.*
*Як быццам ніці ў гэтым ручніку,*
*Так нашы лёсы тут перапляліся.*

*Ўсе разам вышывалі мы ручнік.*
*Ён абярэгам нам, ён нас яднае*
*І з будучым злучае нацянькі, —*
*Нашчадкі нашы радуюцца з намі.*

*Сябры беларускіх суполак розных гарадоў Латвіі па чарзе вышылі сяміметровы ручнік у гонар стагоддзя Латвійскай Рэспублікі.

## Зямлячцы

**М—і**

*Заззялі ласкай неба вочы,*
*Што часта хмурымі былі,*
*Як на чужыне нас аднойчы*
*Зямныя лініі звялі.*

*І зараз разам мы парою*
*Глядзім, як шле радзіма нам*
*Лісты-аблокі,*
*Дзе з табою*
*Туліла нас рака адна.*

*Вялікі лес адзін і той жа*
*Падносіў нам свае дары.*
*Ў адным і тым жа храме Божым*
*Нас прычашчаў святар стары.*

*Вунь зорка ў тым баку маячыць,*
*Акенцам вабіць нас здалля.*
*— Мне Бог паслаў цябе, зямлячка!*
*— З табой мне свет мілей, зямляк!*

*Спяшым паклон аддаць з любоўю,*
*Што ўзгадавала нас, зямлі.*
*І ўдзячны краю, дзе з табою*
*Жыцця дарогі нас звялі.*

## На Масленку

*Хоць сівер дзьме яшчэ парой,*
*Сняжынак кружыць рой,*
*Аднак ужо чароўная*
*Вясна не за гарой!*

*І як у нашых прадзедаў*
*Было спакон вякоў, —*
*Ў гуморы добры люд гудзе —*
*Здалёк чуваць вакол.*

*На Масленку спяшаемся*
*Да цешчы на бліны.*
*З маканкаю, з варэнькамі*
*Ой, смачныя яны!*

*Сустрэўшыся, абдымемся,*
*Бо ў згодзе зажылі, —*
*Пра той блінец забылі мы,*
*Што комам быў калісь!*

*На Масленку спяшаемся*
*К свякроўцы на бліны.*
*Як сонейка вясновае,*
*Так радуюць яны!*

*На Масленку разгульную*
*Вуркочыцца кату,*
*Бо і яму падносім мы*
*Такую смакату!*

*І дзеці, і дарослыя,*
*Катаемся з гары,*
*І, стаўшы ў круг, любуемся:*
*Зімы касцёр гарыць.*

*І, Масленку праводзячы,*
*Не трэба гараваць, —*
*Адзін другому будзем мы*
*Памылкі дараваць…*

Генадзь АЎЛАСЕНКА

# Хто ловіцца на чаравік?

## *Казачная гісторыя для дарослых*

Як гэта сумна, калі рыба не клюе!

І хоць часта кажуць, што галоўнае на рыбалцы не ўлоў, а так званае яднанне з прыродай... ды маняць яны, тыя, хто так кажа! Якое тут «яднанне», калі паплавок нават не варухнуўся ані разу?! А тут яшчэ гэты тып у акулярах, што стаіць за спінай і, здаецца, вачэй з паплаўка не зводзіць! Можа, таму і кляваць перастала, дакладней, і не пачынала нават?

Тып у акулярах, малады чалавек гадоў дваццаці, няскладны і хударлявы, прыпёрся на гэтую прыстань амаль паўгадзіны таму. Проста праходзіў міма і раптам спыніўся, задуменна пазіраючы на паплавок. З таго часу і тырчыць тут нерухома, нібыта цвікамі да зямлі яго прыбілі.

— Паслухай, — не вытрымаўшы, звярнуўся рыбак да юнака, — калі табе так падабаецца рыбалка, чаму б тады самому не паспрабаваць заняцца гэтай справай? Замест таго, каб…

Не дагаварыўшы, рыбак замаўчаў, а юнак неяк няўпэўнена паціснуў плячамі.

— Па-першае, у мяне няма вуды, — прагаварыў ён амаль вінавата.

— А па-другое? — спытаўся рыбак, зноўку пераводзячы погляд на паплавок. — Ды клюйце ж вы ўжо! Колькі чакаць?!

— Па-другое, у мяне проста не хопіць цярплівасці вось так сядзець і марна глядзець на паплавок.

— А стаяць і марна пазіраць, як другія ловяць, у цябе, як бачу, цярплівасці хапае! — буркнуў рыбак, з раздражненнем змяняючы прынаду і зноў закідваючы вуду.

І тут яму ў галаву прыйшла адна думка. Выдатная, можна сказаць, думка! Адразу ж двух зайцаў, як кажуць! І назіральніка гэтага куды далей сплавіць, і заадно добранька з яго пажартаваць.

— Паслухай! — адклаўшы ў бок вуду, рыбак падышоў ушчыльную да юнака. — З цярплівасцю ў цябе ўсё ў парадку, а рыбалоўныя прылады... — Змоўкшы на хвіліну, рыбак уважліва аглядзеўся па баках. — Іх я табе зараз арганізую!

Падхапіўшы з зямлі доўгі сукаваты кіёк, рыбак выцягнуў потым з кішэні скрутак з тонкай вяровачкі, акуратна яе разматаў, потым трывала прымацаваў да кійка.

— Так, вуда і лёска ў нас ужо ёсць, застаецца толькі прынаду прыладзіць, — прамармытаў ён, зноўку азіраючыся па баках. — Ага, вось гэта павінна падысці!

Выхапіўшы з травы стары дзіравы чаравік, рыбак прывязаў яго да процілеглага канца вяровачкі.

— Цудоўная вуда выйшла, праўда? І выключна на буйную рыбу!

— Сапраўды? — нясмела пацікавіўся юнак. Потым ён памаўчаў крыху і спытаўся яшчэ больш нерашуча: — А якая рыба можа паквапіцца на чаравік?

— Сом! — не задумваючыся, адказаў рыбак. — Альбо шчупак двухметровы! Ну, чаго чакаеш, трымай сваю вуду!

Юнак нерашуча ўзяў з рук рыбака «вуду» і хацеў ужо закінуць, як рыбак перахапіў ягоную руку.

— Тут шчупакі не водзяцца! — аўтарытэтна заявіў ён. — А вунь за тым хмызняком іх процьма, так што шыбуй туды і цягай, колькі пажадаеш!

Рыбак і сам не верыў, што ягоны жарт удасца, але, як не дзіўна, менавіта гэта і адбылося. Ускінушы на плячо свой кій, юнак паслухмяна падаўся ў бок хмызняку, потым да рыбака данёсся характэрны ўсплёск.

— Ну і ідыёт! — пакруціў галавой рыбак. — Такіх пашукаць яшчэ!

У гэты час паплавок уздрыгнуў, шпарка пайшоў убок і рыбак, забыўшыся пра ўсё на свеце, спрытна падсек. Імгненне… і вось ужо ладны падлешчык затрапятаў на траве.

— Пачатак ёсць! — задаволена прамармытаў рыбак, зноўку закідваючы вуду. І амаль адразу выцягнуў яшчэ аднаго падлешчыка.

А потым яшчэ і яшчэ... І толькі калі ўзрадаваны рыбак выцягнуў шостага па ліку падлешчыка, паплавок нарэшце супакоіўся і зноўку застыў нерухома.

І ў гэты самы час з-за кустоў пачуўся ўсхваляваны голас юнака.

— У мяне штосьці клюнула! Вялізнае, здаецца!

— Сом! — іранічна выгукнуў у адказ рыбак, і тут яму нечакана шкада стала гэтага недарэку ў акулярах. — Паслухай, я ж проста пажартаваў! А чаравік твой, хутчэй за ўсё, за карчажыну нейкую зачапіўся!

— Ды не! — яшчэ больш узбуджана выгукнуў юнак. — Там штосьці яго тузае! Жывое штосьці!

— Ды што ты такое кажаш?!

Ні капелькі не паверыўшы юнаку (ды і як у такое можна паверыць!), рыбак, тым не менш, зноўку адклаў у бок вуду і накіраваўся да юнака. А там…

З вады, трымаючы у руцэ чаравік, раптам высунулася амаль па пояс поўнасцю аголеная дзяўчына. Вельмі прыгожая, з доўгімі блакітнымі валасамі і вялізнымі, сінімі, як валошкі, вачыма.

— Ну і далей што? — прагаварыла яны крыху хрыпатым, але, тым не менш, надзвычай прыемным голасам. — Што далей, я пытаюся?

Гэта было так нечакана і так нерэальна, што і рыбак, і юнак, нічога на гэта не адказваючы, толькі моўчкі ўтаропіліся ў незнаёмку.

— Так і будзеце на мяне моўчкі пазіраць? — насмешліва хмыкнула тая. — Кавалеры, называецца! Стаяць, пазіраюць… а каб дапамагчы…

— Дапамагчы ў чым? — не прагаварыў — прашаптаў юнак.

— З вады вылезці! А... Дачакаешся ад вас дапамогі! — Дзяўчына хуценька выбралася на бераг, кінула ў траву чаравік і шырока раскінула ў бакі рукі. — О, мой каханы! Мой адзіны! Нарэшце мы стрэліся!

— Ты мне таксама падабаешся! — пачаў рыбак, але дзяўчына зірнула недаўменна.

— Не разумею: пры чым тут ты?!

Потым яна хуценька падбегла да юнака, моцна яго абняла, палка пацалавала ў вусны.

— Ты зняў з мяне чары, мой вызваліцель!

— Якія чары? — усё яшчэ нічога не разумеючы, прашаптаў юнак.

— А такія! Я — рачная німфа, але мне так надакучыла жыць у вадзе! А пакінуць гэты абрыдлы вадаём сама я не магла. Хтосьці павінен быў зняць з мяне чары... І ты гэта зрабіў, першым за столькі гадоў, закінуўшы вуду з чаравікам замест прынады! Гэта і была адзіная ўмова майго вызвалення!

— Чорт! — выгукнуў злосна рыбак і ў гэты самы час у вадзе штосьці гучна плюхнула. — Што гэта?

— Не звяртай увагі! — махнула рукой німфа. — Ёй проста зайздросна!

— Каму гэта, ёй? — насцярожыўся юнак.

— Я ж кажу: не звяртайце ўвагі! — другі раз махнуўшы рукой, німфа зноўку абяруч абхапіла юнака за шыю, прыпала да ягоных абветраных вуснаў. — О, мой каханы, мой адзіны! Цяпер я твая назаўсёды! Ці ты, можа, супраць?

— Ды не, я не супраць! — сумеўся юнак. — Ты вельмі мне падабаешся! Вось толькі…

Не дагаварыўшы, ён замаўчаў.

— Вось што значыць: дурням шанцуе! — з зайздрасцю буркнуў рыбак. — І чаму б гэтай німфе не быць маёй назаўсёды?

— Калі б мяне злавіў на чаравік ты, я была б тваёй! А зараз… — Зноў павярнуўшыся да юнака, яна дадала пяшчотна: — Я стану табе выдатнай жонкай, выканаю ўсе твае жаданні, любы!

— Ну, і якія ж, напрыклад? — саркастычна пацікавіўся рыбак.

— Ды самыя розныя! — паціснула плячамі німфа. — Як толькі ён захоча паснедаць альбо павячэраць — я адразу ж прыгатую самыя смачныя і вытанчаныя стравы. У яго заўсёды будзе чыстае адзенне і чыста ў кватэры. А яшчэ… — Тут яна памаўчала крыху і дадала сарамліва: — Ноччу, у ложку, я таксама буду выконваць усе жаданні свайго каханага…

— І гэта ўсё, што ты можаш? — хмыкнуў рыбак. — Прабач, але ж такія жаданні могуць выконваць усе без выключэння жанчыны! — Тут ён змоўк на хвіліну і чамусьці горка ўздыхнуў. — Дакладней, амаль усе…

Нічога на гэта рыбаку не адказаўшы, німфа ўважліва паглядзела на юнака.

— Любы, — прашаптала яна ўсё з той жа пяшчотай у голасе, — я толькі што прачытала твае думкі, а яны ў цябе вельмі сумныя! У цябе зусім няма грошай і, наогул, ты шмат каму павінен значныя сумы. Гэта так?

— Так! — уздыхнуў юнак. — Выходзіць, я вельмі незайздросны кавалер…

— Няўжо? — з нейкай нават насмешкай усклікнула німфа і пляснула ў далоні. — А ну, расчыні свой рукзак!

— Навошта? — не зразумеў юнак. — Там нічога няма!

Расчыніўшы рукзак, юнак нейкі час недаўменна пазіраў на грошы, якіх у рукзаку было шмат і нават занадта.

— Адкуль гэта… — пачаў ён, але тонкія пальчыкі німфы пяшчотна закрылі ягоныя вусны.

— Не мае значэння, любы! — прашаптала німфа. — Гэтыя грошы твае, дакладней, нашы! А мала будзе — ты толькі скажы!

— Я зрабіў гэтую чортаву вуду! — раптам закрычаў рыбак і ў рэчцы зноўку штосьці гучна плюхнула. — Вось гэтымі самымі рукамі! Я даў яе гэтаму цяльпуху ў акулярах! Я навучыў яго, як закідваць! Гэта ўсё я, а не ён! Дык чаму ж тады…

Не дагаварыўшы, ён змоўк, але німфа выдатна зразумела тое, што хацеў сказаць, ды не сказаў рыбак.

— Усё гэта так, — слушна заўважыла яна. — Але ж, робячы гэтую вуду, ты хацеў толькі пажартаваць з майго каханага! Так што правільна, што ты празваў свой шанц... Ты проста не заслугоўваў яго, вось і ўсё!

— Чорт! Чорт! Чорт! — не ведаючы, што і адказаць на такое, затупаў нагамі рыбак і раптам змоўк, прыслухоўваючыся. — Ды што там увесь час плюхае?! Шчупакі?

— І вялізныя! — з лёгкай іроніяй у голасе адазвалася німфа. — Хочаш іх злавіць?

— Ды што мне з тых шчупакоў, чорт бы іх усіх пабраў! — з роспачу ўсклікнуў рыбак. — Я цябе жадаю злавіць, альбо такую, як ты! І вось жа, чорт... Слухай, — раптам насцярожыўся ён, — здаецца, гэта не рыба плюхае! Скажы… а можа… можа, у рэчцы яшчэ хтосьці водзіцца?

— У рэчцы хто толькі не водзіцца… — шматзначна і нават загадкава адазвалася німфа.

— Ды я не пра тое! — махнуў рукой рыбак. — Хтосьці, падобны да цябе, там яшчэ застаўся?

— Магчыма! — яшчэ больш загадкава прамовіла німфа.

— Праўда?! — Узрадаваны рыбак нахіліўся, хуценька падхапіў кіёк з чаравікам. — А што, калі я… калі я таксама закіну чаравік? Злаўлю я сваё шчасце?

— Ты толькі тут не закідвай, — думаючы аб нечым сваім, параіла німфа. — Ідзі вунь за той хмызнячок. Бо тут я жыла, а яе тэрыторыя менавіта там, далей!

— Яе, гэта каго? — усхвалявана запытаўся рыбак.

— Маёй рачной сяброўкі, — патлумачыла німфа і чамусьці весела рассмяялася. — Здаецца, ёй таксама надакучыла жыць у вадзе, так што, спяшайся! Каб ніхто не апярэдзіў!

— Не апярэдзіць! Не паспее!

Размахваючы кійком з чаравікам, рыбак амаль подбегам падаўся да хмызнячка, а юнак задумліва паглядзеў яму ўслед.

— Там што, і сапраўды жыве твая сяброўка?

Не адказваючы, німфа толькі сцвярджальна кіўнула.

— І яе таксама можна злавіць на чаравік?

— Выключна на чаравік! — думаючы аб нечым сваім, прагаварыла німфа. — І ні на што іншае!

— І ён яе зловіць?

— Нават не сумняваюся ў гэтым! Вунь, здаецца, ужо цягне!

— Ну што ж, — задумліва прагаварыў юнак. — Значыцца, ён таксама злавіў сваё шчасце!

— А вось у гэтым я вельмі сумняваюся! — засмяялася німфа і ў гэты ж самы час да юнака данёсся адчайны крык. — Ну, што я казала! Вунь, глядзі, каго ён з вады выцягнуў!

З-за хмызняка выбег рыбак, а за ім з чаравікам у руцэ спяшалася нейкая вялізная страхалюдная істота: уся ў чорнай балотнай тване, на галаве рогі, за спінай хвост доўгі матляецца…

— Адчапіся ад мяне! — азірнуўшыся, спалохана заламантаваў рыбак, усё паскараючы і паскараючы бег. — Чаго табе?!

— О, мой любы, мой адзіны! — нізкім глухім голасам адазвалася пачвара, не адстаючы ад небаракі ні на крок. — Ты зняў з мяне чары, і цяпер я твая да смерці!

— Д-да чыёй смерці?! — нервова выгукнуў рыбак, хапаючыся абяруч за галаву. — Д-да тваёй?

— Да тваёй, вядома! Маё жыццё доўгае!

— А-а-а! — прабягаючы зусім побач з німфай і юнаком, прагаласіў рыбак. — Ратуйце! Дапамажыце!

— Зараз дапамагу, мой збавіцель! Толькі не ўцякай ад мяне, мой адзіны, мой непаўторны! О, як жа моцна я цябе кахаю!

— Адчапіся ад мяне, чуеш, адчапіся! — данёсся ўжо здалёк голас рыбака. — У мяне дома ўласная жонка маецца! Амаль такое ж пудзіла!

— Ну вось і добра! Цяпер два пудзілы ў тваім доме жыць будуць!

Галасы рыбака і страхалюднай істоты паступова заціхлі.

— Хто гэта? — недаўменна спытаўся юнак, паварочваючыся да німфы.

— Мая рачная сяброўка, — патлумачыла німфа. — Чарцяка балотная!

— Якая жудасная! — аж перасмыкнуўся юнак, потым да яго дайшло яшчэ нешта:

— Чакай, дык што, я таксама мог яе выцягнуць замест цябе? — у дрыготкім голасе юнака быў самы сапраўдны жах.

— Супакойся, не мог ты яе выцягнуць! — весела рассмяялася німфа. — Бо ў нас з сяброўкай дамоўленасць такая была: я лаўлюся першай! А ведаеш, чаму?

— Чаму? — з уяўнай палёгкай запытаўся юнак.

— А таму, што калі б яе выцягнулі першай, — патлумачыла німфа, — наўрад ці бы хто асмеліўся яшчэ разочак закінуць у рэчку чаравік!

## Не толькі ў каталогах

На базе Навагрудскай бібліятэкі адбыліся IV Шчорсаўскія чытанні «Прыватныя кніжныя зборы: гісторыя і сучаснасць». Кнігазаўцаў, навукоўцаў, аматараў літаратуры паяднаў аграгарадок Шчорсы — былыя ўладанні асветніка і гуманіста Яўхіма Храптовіча.

Навагрудская бібліятэка падрыхтавала экспазіцыю літаратуры каштоўных кніг з асабістых бібліятэк чытачоў горада Навагрудка і Навагрудскага раёна, калекцыю факсімільных выданняў, энцыклапедый, калекцыю геаграфічных і турыстычных карт, «Залатую калекцыю беларускай літаратуры», калекцыю паштовак. Асобна былі прадстаўлены кнігі з бібліятэкі прафесара, літаратуразнаўцы В. А. Чамярыцкага. Удзельнікі чытанняў з экскурсіяй наведалі сядзібу «Шчорсы» і экспазіцыю міні-музея міні-макетаў раённай бібліятэкі «Страчаная спадчына». Культурную праграму чытанняў аздобіла тэатралізаванае прадстаўленне «Прыгоды Навагрудскай лекаркі Саламеі Русецкай».

***

З нагоды 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна прапануе аднавіць веды аб жыцці і творчасці нацыянальных класікаў Беларусі і даведацца пра цікавыя факты з іх жыцця з дапамогай адмысловых віртуальных віктарын. Шмат цікавага кніжніца прапануе і да летняга сезона: літаратурныя квэст-гульні па аддзелах бібліятэкі, пазнавальна-інтэрактыўны квіз «Юбілейныя каралі», літаратурнае асарці, кніжная выстаўка-чамадан. Самыя актыўныя будуць адзначаны прызамі.

***

У Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага прайшла IV Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання». Падчас работы секцый абмяркоўвалі кнігі і кніжнасць у кантэксце часу, аглядалі Брэстчыну гістарычную пачынаючы з XVI ст. Былі прэзентаваны кнігі А. А. Гладышчука «Замак Берасцейскі», В. В. Мароза «Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны: нарысы гісторыі, археалогіі і культуры» (Мінск, 2018). У гонар дзесяцігоддзя з часу адкрыцця праекта адбылася цырымонія ўзнагароджвання ўдзельнікаў канферэнцыі знакам «10 гадоў Берасцейскім кнігазборам», а таксама падпісаны «Пагадненні аб супрацоўніцтве…» Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага з Ваяводскай публічнай бібліятэкай імя І. Лапацінскага (Люблін, Польшча) і Цэнтральным дзяржаўным архівам г. Санкт-Пецярбурга (Расія).

***

У Віцебскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна зладзілі сустрэчу з найстарэйшым края-знаўцам Віцебска — 90-гадовым Валянцінам Арловым. Ён аўтар кніг «Каляды ў народнай міфалогіі» і «Купалле — макушка лета». Валянцін Мікалаевіч падзяліўся меркаваннем пра стан беларускай мовы. Плённую дзейнасць краязнаўцы засведчылі фотаздымкі са шматлікіх экскурсій, якія Валянцін Арлоў правёў па вакольцах Віцебска.

**Наталля СВЯТЛОВА**

# ДА ІНАВАЦЫЙ

## Жодзіна прымала дэлегатаў V Форуму бібліятэкараў

Пяты, юбілейны, форум бібліятэкараў Беларусі сабраў амаль 400 аўтарытэтных прадстаўнікоў гэтай прафесіі, якія абмяркоўвалі пытанні нарматыўна-прававога забеспячэння галіны, арганізацыі карпаратыўнага ўзаемадзеяння бібліятэк у сферы забеспячэння доступу насельніцтва да інфармацыйна-бібліятэчных рэсурсаў. Пытанні былі абумоўленыя тэмай форуму: «Гуманітарна-асветніцкая дзейнасць бібліятэк у кантэксце агульначалавечых каштоўнасцей і беларускай дзяржаўнасці». Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларуская бібліятэчная асацыяцыя і Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

У рамках форуму на базе Цэнтральнай гарадской бібліятэкі г. Жодзіна прайшло выязное пасяджэнне «Інавацыйныя формы работы публічнай бібліятэкі». Жодзінская бібліятэка лічыцца адной з лепшых у рэспубліцы, таму і такі давер — прымаць высокіх гасцей са сталіцы. У Жодзіне ўдзельнікі форуму азнаёміліся з інавацыйнымі формамі працы бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва. Напрыклад, як ва ўмовах аптымізацыі не толькі захаваць дасягненні, але і прасоўваць бібліятэчную справу наперад. Ці як звычайную лесвіцу на трэці паверх ператварыць з дапамогай кніг-даведнікаў і арыгінальнага афармлення ў «Лесвіцу ведаў».

Запатрабаванасць паслуг, прапанаваных цэнтральнай гарадской бібліятэкай, толькі даказвае, што інавацыйны падыход да бібліятэчнай справы даюць свае вынікі. Як адзначыў адзін з дэлегатаў форуму, яму было чаму павучыцца ў сваіх жодзінскіх калег.

На памяць аб сустрэчы арганізатары форуму падарылі жодзінскім бібліятэкарам падарункі: Беларуская бібліятэчная асацыяцыя — унікальную кнігу «Сусветная мастацкая культура», а Нацыянальная бібліятэка ў найбліжэйшы час паставіць новыя дубовыя шафы для каталогаў.

**Віталь ЖУРАЎСКІ**

# Паэтычна — пра каханне

У Мінскім гарадскім тэатры паэзіі, што створаны некалькі гадоў таму сталічным аддзяленнем СПБ і працуе пры Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Янкі Купалы, адбылася творчая імпрэза «Калі каханнем поўніцца душа…». Яна была прысвечана творчасці сучасных паэтаў Беларусі Анатоля Аўруціна, Міхася Пазнякова і Міколы Шабовіча. Рэжысёрамі і сцэнарыстамі спектакля выступілі Вольга Багушыньска і Святлана Яфрэмава. Вядучая імпрэзы — артыстка эстрады і Мінскага гарадскога тэатра паэзіі Вольга Багушыньска.

Гучалі вершы паэтаў, а таксама песні на іх творы ў выкананні Дзмітрыя Пятровіча, Таццяны Жылінскай, Іны Кравец і Сяргея Краўца. Слынныя творцы адказвалі на рамантычныя пытанні, дзяліліся ўспамінамі аб высокіх юнацкіх пачуццях, падмацоўвалі гэта вершамі. Спектакль суправаджаўся музычным афармленнем і паказам фотапрэзентацый на вялікім экране. Удзельнікаў свята парадавалі цікавыя рэжысёрскія знаходкі і сюрпрызы. У зале панавала ўзнёсласць, што стварыў у тым ліку і водар ландышаў, якімі паэты шчодра адорвалі жанчын — удзельніц імпрэзы. А закончылася ўсё прыгожым вальсам. Танцавалі не толькі паэты з артыстамі, але і многія гледачы і слухачы.

**Павел КУЗЬМІЧ**

# На памяць аб сустрэчы з нобелеўскім лаўрэатам

## Як тэатр аднаго акцёра працуе на карысць кніжніцы

30 гадоў таму, 17 чэрвеня 1988 года, 40-гадовая пісьменніца, цяпер першы беларускі нобелеўскі лаўрэат Святлана Алексіевіч наведала Беразіно, адбылася незабыўная сустрэча з мясцовай інтэлігенцыяй, з бярэзінскімі кнігалюбамі. Шырокую папулярнасць на той час ужо набыла першая кніга спадарыні Святланы «У вайны не жаночы твар», якая пабачыла свет у 1985 годзе да 40-годдзя Вялікай Перамогі. Кніга адразу вылучылася неардынарнасцю і трапіла ў фондах бярэзінскіх бібліятэк у разрад краязнаўчай каштоўнасці, бо ў ёй змешчаны ўспаміны 5 нашых зямлячак — удзельніц вайны. На памяць аб сустрэчы на Бярэзіншчыне пісьменніца пакінула аўтограф на кнізе, якая цяпер з'яўляецца рарытэтам Бярэзінскай раённай бібліятэкі.

Сама сустрэча і неардынарная асоба С. Алексіевіч яшчэ напрыканцы 80-х паслужыла штуршком пільнай увагі бібліятэкараў да яе творчасці. Да 60-годдзя вызвалення Беларусі і 60-годдзя Перамогі ў 2004—2005 гг. упершыню на Бярэзіншчыне пачаў трыумфальнае шэсце тэатр кнігі С. Алексіевіч «У вайны не жаночы твар». Шырокай публіцы былі прадстаўлены самыя пранікнёныя старонкі, улічваючы, што яркія эпізоды, узмоцненыя тэатралізацыяй, выклікаюць цікавасць да ўсяго твора, служаць найлепшай рэкламай.

З аднолькавай цікавасцю тэатр без заслон паводле знакавай кнігі Алексіевіч успрымалі ў вучнёўскім класе і ў швейным цэху, на пасяджэннях грамадскіх таварыстваў і аматарскіх суполак, на жаночых пасядзелках і літаратурных вечарынах. Да 20-годдзя вываду савецкіх войск з Афганістана дэбютаваў тэатр маналогу паводле кнігі Алексіевіч «Цынкавыя хлопчыкі». У 2011 годзе да 25-годдзя Чарнобыльскай трагедыі каралевай бібліятэчнага тэатра стала знакавая кніга С. Алексіевіч «Чарнобыльская малітва».

Калі ў 2013 годзе бярэзінскія бібліятэкары праводзілі шырокамаштабную агіткампанію па прафілактыцы суіцыду, у 16 арганізацыях і ўстановах горада гучалі монатэатралізаваныя маналогі «Недаспяваная песня жыцця» паводле кнігі пісьменніцы «Зачараваныя смерцю». У 2015 г. да 70-годдзя Перамогі жыхары бярэзінскіх аграгарадкоў на «ўра» сустракалі цягнік мужнасці з тэатралізаванымі прадстаўленнямі «Ішлі дзяўчаты па вайне», «Дзеці без дзяцінства» паводле твораў Алексіевіч «У вайны не жаночы твар», «Апошнія сведкі». Не адно дзесяцігоддзе кнігі спадарыні Святланы, якія ажывіў тэатр Бярэзінскай раённай бібліятэкі, шчыра размаўляюць са слухачамі.

Сёлетні 70-гадовы юбілей пісьменніцы паслужыў цудоўнай нагодай для прэзентацыі яе твораў пад дэвізам «5 кніг — 5 шэдэўраў юбіляра». Тэатр аднаго акцёра прадставіў маналогі герояў кніг Алексіевіч для вучнёўскай моладзі аграгарадка Лешніца. Такая форма папулярызацыі арыгінальных мастацкіх твораў дазволіла стварыць гукава-зрокавыя яркія вобразы, эмацыянальна данесці разнастайную гаму думак, пачуццяў, адчуванняў жанчын-франтавічак, дзяцей вайны, матулі воіна-афганца, жонкі ліквідатара аварыі на ЧАЭС. Выступленне бібліятэчнага выязнога тэатра кнігі ладзілася ў аграгарадку Любушаны, у мясцовым сельскім Доме культуры. Сімбіёз літаратуры і мастацтва дазволіў любушанскім школьнікам убачыць кнігі С. Алексіевіч праз прызму сцэнічнага майстэрства. Уступны імправізаваны маналог «пісьменніцы» «Я павяду вас дарогай успамінаў» і заключны маналог «Я не спавядальнік, не лекар, не суддзя, я такі ж чалавек, як і вы», увасоблены бібліятэкам-акцёрам, дазволілі пераканаўча перадаць жыццёвае і пісьменніцкае крэда Святланы Алексіевіч.

**Тамара КРУТАЛЕВІЧ,**
**загадчык аддзела маркетынгу Бярэзінскай ЦРБ, аўтар праекта «Жывая кніга»**

# Караткевіч — мастак?

## З нечаканага боку творцу прадставіла Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі

Талент прагне ўвасаблення ў розных матэрыях. Часта мастакі слова малююць і фарбамі. Пісьменніцтва і жывапіс быццам мацуюцца адзін ад аднаго, паўней раскрываючы асобу, актывізуючы розныя грані. Міхаіл Лермантаў выяўляў сябе не толькі ў слове, але і ў жывапісе, таксама і Аляксандр Пушкін. Малявалі і такія сусветна вядомыя літаратары, як Уладзімір Маякоўскі, Максіміліян Валошын, Віктор Гюго, Антуан дэ Сент-Экзюперы… Беларускі пясняр зямлі пад белымі крыламі Уладзімір Караткевіч таксама быў не толькі мастаком слова. У фондах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ёсць малюнкі Уладзіміра Караткевіча, іх паказваюць падчас адмысловых выставак (напрыклад, падчас «Бібліяночы»).

У ЦНБ НАН захоўваюцца таксама архівы Язэпа Драздовіча. «Архіў Драздовіча перадаў мастак Пётр Сергіевіч і сваякі мастака, архіў Караткевіча — пляменніца Алена Іванаўна Сінкевіч, — адзначае навуковы супрацоўнік аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі Віктар Свякла. — Рукапісы Караткевіча мы вырашылі не выстаўляць: яго, вядома, чыталі, а вось як ён маляваў, напэўна, ведаюць не ўсе. Якіясьці малюнкі можна аднесці да пэўных твораў».



Караткевіч-мастак — адкрыццё?! Ці распаўсюджаная з'ява сярод айчынных пісьменнікаў? Васіль Быкаў, дарэчы, вядома, вучыўся ў Віцебску ў мастацкім тэхнікуме.

Прадстаўленыя малюнкі з архіва Караткевіча хутка будуць скарыстаны для новага выдання. «У выдавецтве "Мастацкая літаратура" рыхтуецца збор твораў Уладзіміра Караткевіча. Малюнкі ўжо ў нас заказвалі для сканавання, — расказвае Віктар Свякла. — У кнізе іх будзе намага больш, чым на выстаўцы».

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» пачало рыхтаваць 25-томнае выданне твораў Уладзіміра Караткевіча ў 2011 годзе. У збор уключаюцца творы, якія не друкаваліся пры жыцці пісьменніка, малюнкі, лісты, дзённікі, сцэнарыі дакументальных і мастацкіх фільмаў, інтэрв'ю, выступленні. Тэксты друкуюцца з адмененымі нематываванымі рэдактарскімі і цэнзарскімі праўкамі.

**Наталля СВЯТЛОВА,**
**фота аўтара**

**На фота:** малюнкі Уладзіміра Караткевіча, прэзентаваныя ў ЦНБ НАН Беларусі падчас «Бібліяночы».

**Конкурс «УРОКІ СУЧАСНАСЦІ»**

# АДЛЮСТРАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАГА МІНУЛАГА Ў БАЛАДАХ ВІКТАРА ШНІПА

## Урок пазакласнага чытання па беларускай літаратуры ў 11 класе

**Абгрунтаванне актуальнасці тэмы.** Балады з кнігі Віктара Шніпа «Балада камянёў» (2006) — творы сучаснай беларускай паэзіі. На ўроку разглядаюцца балады, у якіх адлюстравана гістарычнае мінулае нашага народа. Сёння нямногія разумеюць беларускую паэзію. І мала тых, хто паважае і любіць беларускую мову. Гэтаму трэба вучыць, бо кожны сучасны паэт спадзяецца на падтрымку, паразуменне і чакае свайго чытача.

**Арыгінальнасць правядзення ўрока.** Вучні працавалі ў групах. Праца накіравана на тое, каб навучэнцы зацікавіліся творчасцю Віктара Шніпа, выявілі пазіцыю лірычнага героя разгледжаных балад.

Выкарыстоўваюцца элементы наступных тэхналогій: узроўневая дыферэнцыяцыя, развіццё крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо. Прыём «Сінквейн» дапамог падвесці вынікі работы, вызначыць стаўленне вучняў да сучаснай паэзіі.

**1.** Работа з эпіграфам

Эпіграф да ўрока:

*Так мала чытачоў,*
*І тыя ўсе паэты.*
*І ўсё ж жыве, аднак,*
*Надзея, і здаецца,*
*Што хоць душа адна*
*На слова адзавецца.*

(Леанід Галубовіч)

Вызначце самыя галоўныя словы ў гэтай страфе. Абгрунтуйце выбар.

**2.** Праверка дамашняга задання. Паведамленні вучняў пра жыццёвы і творчы шлях В. Шніпа. Паўтарэнне пройдзенага матэрыялу (Што такое балада? З якімі баладамі вы ўжо знаёмыя, хто іх напісаў?)

**3.** Работа ў групах. Клас загадзя дзеліцца на 3 групы. Кожнай групе прапанавана свая балада і заданні да яе на картцы. У кожнага на стале ляжаць кнігі з баладамі. Спачатку вучні чытаюць твор самастойна, потым усе члены групы працуюць разам, рыхтуюць адказы на заданні (вызначаюць тэму і ідэю твора і г. д.). Затым нехта адзін выразна ўголас чытае баладу і члены групы па чарзе даюць адказы на пытанні на картцы.

1 група — «Балада Турава».
2 група — «Балада Сымона Буднага».
3 група — «Балада Белай вежы».

Заданні на картцы для 1 групы:

• Прыгадаць кароткія гістарычныя звесткі пра горад Тураў.

• Адказаць на пытанні:

Чаму менавіта радок «На Беларусі Бог жыве» У. Караткевіча В. Шніп выбраў у якасці эпіграфа да свайго твора? Звярніце ўвагу і на заключны радок балады («…як любіць Беларусь наш Бог…»).

Што адчуваем, калі чытаем «Баладу Турава»? Чаму паэт расказвае пра турыны рог? Сімвалам чаго ён можа быць? Чаму гучаў і цяпер гучыць турыны рог?

• Прааналізаваць мастацкія асаблівасці мовы «Балады Турава».

Заданні на картцы для 2 групы:

• Прыгадаць кароткія звесткі пра Сымона Буднага.

• Адказаць на пытанні:

З якой мэтай В. Шніп пасля назвы твора ўказвае гады жыцця Сымона Буднага?

У чым заключаецца сэнс жыцця С. Буднага з пункту гледжання В. Шніпа?

Якое пытанне задае аўтар у баладзе? Які адказ можна даць на гэтае пытанне?

Ці толькі пра мінулае апавядае В. Шніп у «Баладзе Сымона Буднага»? Як аўтар звязвае мінулае з той ці іншай славутай асобай?

• Прааналізаваць мастацкія асаблівасці мовы «Балады Сымона Буднага».

Заданне на картцы для 3 групы:

*Прыгадаць кароткія звесткі пра Камянецкую (Белую вежу).

*Адказаць на пытанні:

У чым выяўляецца значнасць і веліч Белай вежы?

З чым параўноўвае аўтар Белую вежу? Сімвалам чаго з'яўляецца гэты гістарычны помнік?

*Прааналізаваць мастацкія асаблівасці мовы «Балады Белай вежы».

**4.** Самастойная праца з кнігамі, у якіх змешчаны асобныя вершы-балады са зборніка «Балада камянёў». Пытанні:

Пра якіх славутых людзей расказвае паэт у кнізе «Балада камянёў»? Звярніце ўвагу на назвы балад. Якім славутым мясцінам (старажытным гарадам, замкам) прысвяціў В. Шніп свае балады?

Чаму В. Шніп звяртаецца да гістарычнай тэматыкі?

У чым бачыць сэнс жыцця лірычны герой В. Шніпа?

**5.** Выкананне тэставай работы. Пасля напісання тэста вучні абменьваюцца сшыткамі і правяраюць правільнасць выканання заданняў па ключы.

**6.** Дамашняе заданне. Рознаўзроўневыя заданні:

I узровень. Выразнае чытанне балады са зборніка «Балада камянёў» (на выбар вучня).

II узровень. Вывучыць на памяць баладу са зборніка «Балада камянёў» (на выбар вучня).

III узровень. Падрыхтаваць вуснае паведамленне на тэму «Аб чым апавядаюць балады В. Шніпа».

IV узровень. Скласці верш на гістарычную тэматыку.

**Удзел вучняў у занятках.** На пачатку ўрока была праведзена псіхалагічная падрыхтоўка класа да ўспрымання матэрыялу. Вучні самастойна вызначылі мэту ўрока, актыўна працавалі. У дадатак да вышэйзгаданых заданняў кожнай групе трэба было намаляваць эскіз вокладкі для зборніка «Балада камянёў» і абгрунтаваць адлюстраванае. У канцы ўрока вучні паслухалі прытчу, апісалі свой эмацыянальны стан, адказалі, якое значэнне мела для іх работа на ўроку.

**Вынікі.** Выкарыстаны матэрыял садзейнічаў развіццю цікавасці вучняў да творчасці В. Шніпа і іншых сучасных паэтаў, у чыіх творах адлюстравана гісторыя роднага краю, апісана жыццё і дзейнасць славутых людзей, якія працавалі на карысць Радзімы. Заняткі прайшлі эфектыўна, вучні выканалі ўсе прапанаваныя заданні, зрабілі адпаведныя высновы. Адзінаццацікласнікі зацікавіліся творчасцю сучаснага паэта, многія адзначылі, што хацелі б прачытаць і іншыя творы са зборніка «Балада камянёў».

**Сняжана БРЫТАНАВА,**
**настаўніца беларускай мовы і літаратуры Суражскага дзіцячага сада — сярэдняй школы імя Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова**

# Ціхі бунтар

## Эфект нечаканасці ад Сяргея Балянка

Непрадказальны, эксцэнтрычны і ў той жа час неверагодна сціплы. Менавіта гэтымі трыма эпітэтамі характарызуюць сябры і калегі Сяргея Балянка, творчасць якога з самага пачатку прафесійнай дзейнасці ўразіла не аднаго гледача. Гэты мастак умее інтрыгаваць. Тыдзень таму ў галерэі «Арцель» у свой дзень нараджэння спадар Сяргей прэзентаваў выстаўку пад назвай «Так, мы знаёмыя!», у якой прадугледзеў эфект нечаканасці: на вернісажы акрамя графічных работ прадставіў дваццаць дзве жывапісныя карціны.

З асаблівым пачуццём гумару і цёплым адчуваннем жыцця, пад гукі рок-н-рольных матываў ён запрасіў гасцей «пачаставацца» глыбіннай сюжэтнасцю графікі і сонечнымі колерамі жывапісу. Складана зразумець, які Балянок захапляе больш.

— Гэта ўнікальны праект, таму што аўтар з трапятаннем ставіцца да свайго жывапісу, пра які мала ведаюць у мастацкіх колах, — падкрэслівае куратар праекта мастацтвазнаўца Наталля Сяліцкая. — У свой час Сяргея Балянка лічылі нетыповым і скандальным творцам. Ён прыйшоў у мастацтва ў канцы 1980-х і адразу ж стаў ціхім бунтаром: у адрозненне ад іншых беларускіх мастакоў-графікаў ён імкнуўся абавязкова сказаць сваё слова ў нацыянальнай тэме, не пісаў партрэтаў знакамітых дзеячаў культуры. Адразу ж заявіў пра сябе як пра тонкую і эмацыянальную асобу. Сяргей вельмі бераўліва ставіцца да сваіх сноў, па іх успамінах часцяком прыдумляе новыя «сцэнарыі» работ. Свае творы аўтар называе не карцінамі, а малюначкамі. Ён часта паўтарае, што стварае не пра памяць, а па памяці: звяртаецца да ўнутранага свету, разваг, эмоцый. Яго карціны месцамі сюррэалістычная, аўтар вельмі далікатна падбірае для іх назвы паэтычныя і сэнсавызначальныя.

«А снег затрымаўся яшчэ мінулай ноччу...», «Горача. Паляцелі», «Ранняя вясна, неспакойна і зябка», «Добры дзень, а куды вы ідзяце...» Назвы ўцягваюць у графічныя работы Сяргея Балянка, мастака-эстэта, філосафа з жывым розумам. Яго бацька — філосаф, прафесар эстэтыкі, маці — філолаг. Выхаванне ў такой інтэлігентнай сям'і з маленства заклала зерне асаблівага стылю як у паводзінах, так і ў творчасці.

Жывапіс — яшчэ адна грань творчасці Сяргея Балянка. Калі ў графіцы для яго прыярытэтам з'яўляецца лінія, то ў жывапісе ён больш зацікаўлены каларытам. Гледзячы на маляўнічыя работы майстра, складана паверыць, што іх стварыў графік.

— Мне вельмі падабаецца адчуваць сябе жывапісцам, — расказвае Сяргей Балянок. — Падабаецца працаваць з колерам, бо ім можна перадаць добры настрой, цёплую эмоцыю. Часта ў адной карціне я змешваю нацюрморт і пейзаж, якія пераплятаюцца агульнай кампазіцыяй. Працэс зачароўвае. Паколькі да выяўленчага мастацтва я стаўлюся не як да працы, а як да задавальнення, у кожным імгненні ўлоўліваю нешта асаблівае. Цярпець не магу, калі мастакі кажуць, ідучы ў майстэрню, што яны ідуць на працу. Для мяне працаваць і займацца мастацтвам — гэта два розныя паняцці.

У жывапісе спадар Сяргей выкарыстоўвае пастэльныя колеры, паветраную перспектыву. Для яго важна перадаць каляровую разнастайнасць прадметнага свету. Але і тут ён застаецца сабе верным: палотны — не рэалістычныя выявы, а хутчэй «фотаздымкі» памяці, толькі ўжо ў колеры.

— Калі я вучыўся ў Львоўскім паліграфічным інстытуце, у нас былі гадзіны і жывапісу, і малюнка. Мой выкладчык заўсёды казаў, што я прыроджаны жывапісец, — успамінае мастак. — Я часта натхняўся вольным паветрам, змалёўваў пейзажы і атрымліваў ад гэтага неверагоднае задавальненне. Але падчас спецыялізацыі выбраў кірунак кніжнага афармлення і атрымаў працу ў выдавецтве. Доўгі час марыў: як толькі выйду на пенсію — абавязкова займуся жывапісам. Але час вырашыў па-іншаму. Прыкладна ў пяцьдзясят гадоў звярнуўся да колеру: тое, што сядзела ўва мне доўгія гады, проста вырвалася магутнай творчай энергіяй.

Графіка Сяргей Балянка прынесла яму сапраўдную славу. Уменне прадумваць кожную дэталь, а яшчэ надаваць ёй вялікі сэнс — асаблівасць творчага падыходу майстра. Яго ідэальныя лініі можна разглядаць гадзінамі, ёсць асацыяцыі з асабістым унутраным светам.

На выстаўцы прадстаўлена рэтраспектыва графічных твораў Сяргея Балянка пачынаючы з 1986 года. Майстар кажа, што няўдалае мастацтва ён ніколі не паказвае і тым больш не калекцыянуе. А ўсе творы, да якіх не ляжыць душа, наогул знішчае.

У яго дома на ўсялякі выпадак заўсёды ёсць адно ці два чыстыя палотны і некалькі цынкавых пласцін, бо ён ніколі не ведае, якім будзе новы дзень і што яму захочацца пра яго расказаць у малюнку ці ў колеры.

**Вікторыя АСКЕРА,**
**фота аўтара**

# У ШМАТГАЛОССІ МЕРКАВАННЯЎ

Пачатак заўсёды ставіць пытанні і выклікае дыскусіі. «Арт-Мінск» — не першы буйны мастацкі праект у Беларусі, але праз яго акрэсліліся праблемы, якія характэрныя для нашага мастацкага асяроддзя наогул, адна з якіх заключаецца ва ўменні прадстаўляць мастацтва. Паколькі праект выклікаў спрэчкі, мы вырашылі ўдакладніць, якія высновы вынеслі для сябе арганізатары, і звярнуліся да дырэктара Палаца мастацтваў Аляксандра Зінкевіча з пытаннем: «Навошта Мінску "Арт-Мінск"?»

— Калі мы пракруцім стужку часу, то заўважым, што было вельмі шмат цікавых падзей. І часта гэтыя падзеі — нібыта яркія ўспышкі, пра якія гісторыя забывае. А туды былі ўкладзеныя высілкі людзей. І няхай гэтыя падзеі былі сапраўды добрымі выставачнымі праектамі, чалавечая вузкапрафесійная свядомасць можа іх выцясняць з памяці. Калі мяне спытаць, якія выстаўкі праводзіліся пяць гадоў таму, давядзецца паглядзець архіў.

Мінску патрэбныя сістэмныя праекты. Гэта значыць праекты, якія павінны мець гарызонт планавання на найбліжэйшыя 3—5 гадоў. «Арт-Мінск» і «Восеньскі салон» — гэта сістэмныя праекты. Ідэя «Восеньскага салона» на сёння даволі выразна сфармуляваная: ён сфакусіраваны на прэзентацыі маладых аўтараў, а таксама на продажы прадстаўленых твораў. Гэта сведчыць аб тым, што «Арт-Мінск» з цягам часу таксама зможа лаканічна сфармуляваць сваю асноўную задачу.

Усё, што адбываецца на беларускім рынку мастацтва, — гэта досыць раз'яднаныя намаганні вялікага кола людзей. Раз'яднанасць дапушчальная ў тым выпадку, калі арганізатар — Луўр або, напрыклад, фонд Геці. Гэта значыць, калі вы самі ў стане аказваць уплыў на сітуацыю на рынку, калі вы не пакутуеце ад недахопу нейкіх базавых патрэб. Толькі ў такім выпадку вы можаце выступаць з маштабным праектам.

«Арт-Мінск» першапачаткова задумваўся як злучэнне агульных намаганняў для правядзення значнай мастацкай падзеі. І тут важную ролю адыгрывае стварэнне лагістыкі паміж усімі ўключанымі ў гэты праект структурамі (яны павінны навучыцца ўзаемадзейнічаць, пачынаючы ад стварэння агульнага квітка і да адпраўкі агульнага праекта за мяжу). «Арт-Мінск» — гэта не гісторыя пра тое, як некалькі галерэй горада пад адным брэндам адзін месяц неяк узаемадзейнічаюць. Гэта сістэмная праца на працягу года. Аб'яднанне ўсіх высілкаў і сістэмная гадавая праца — гэта канцэпцыя, якую «Арт-Мінск» можа рэалізаваць.

«Арт-Мінск» далёка не проста выстаўка. У будучыні гэта маштабнае мерапрыемства, якое зможа зацікавіць удзельнікаў, гледачоў і прафільныя інстытуцыі і якое зможа вырашаць тыя нявырашаныя праблемы, якія існуюць сёння на рынку мастацтва (такія як вызначэнне культурных каштоўнасцяў, абарот прадметаў мастацтва, выпрацоўка канцэпцыі развіцця культуры). Гэта значыць, мы пазіцыянуем «Арт-Мінск» як базавую маштабную арт-выстаўку. Бо, калі гэта разавае мерапрыемства, прысвечанае значнай даце, яго даволі складана ператварыць у доўгатэрміновы праект. Мне здаецца, што мерапрыемства з гісторыяй і вялікім бэкграўндам мае больш шанцаў на жыццё.

Мы правялі першы фестываль, у выніку якога аб'ядналіся 18 праектаў. На наступны год у нас ёсць цэлы спіс праблем, якія трэба будзе вырашаць: якой з пляцовак якія праекты падыходзяць, як паміж сабой камунікаваць, як згрупаваць аўтараў, як прадстаўляць замежныя пляцоўкі.

Збольшага гэта перайманне суседскага досведу. Так, эканоміка кожнай краіны адрозніваецца, і інвеставанне ў культуру і мастацтва ў кожнай з іх мае свае асаблівасці. Напрыклад, «Арт-Базель» — камерцыялізаванае прадпрыемства. Гэта такі акумуляцыйныя эфект, калі праходзіць якаснае мастацкае мерапрыемства, якое стала гістарычным прэцэдэнтам і пры гэтым мае зразумелую камерцыйную сістэму.

Вядома, цяпер гэта футуралогія. Але гэтым трэба займацца. Бо такое мерапрыемства можа прывесці да прытоку турыстаў, да пазнавальнасці краіны і г. д. Бо, напрыклад, «Арт-Вільнюс» ужо прадстаўляе Літву як годнага ўдзельніка еўрапейскай мастацкай і рынкавай прасторы.

У «Арт-Мінска» ёсць і вузкаспецыялізаваная задача. Раз у год мы запрашаем беларускіх аўтараў прадставіць лепшыя і найноўшыя творы. Гэта своеасаблівы маніторынг актыўнасці мастакоў, яны будуць разумець, што павінны кожны год прадстаўляць навінкі. З іншага боку, «Арт-Мінск» — гэта не біенале, дзе прадстаўлены выключна *contemporary art*. «Арт-Мінск» мае вельмі нейтральную назву, якая можа ўключаць самыя розныя выказванні. Гэта магчымасць прыцягнуць гледачоў да наведвання выставак, што, у сваю чаргу, можа падштурхнуць нас да стварэння інфраструктуры, нейкага спецыяльнага асяроддзя для прэзентацыі сучаснага мастацтва. Акрамя таго, гэта мерапрыемства, якое павінна быць талерантным да шматгалосся меркаванняў. Бо кожная пляцоўка павінна сфармуляваць сваю пазіцыю. Гэта зможа сфарміраваць галерэйны бізнес.

Такое мерапрыемства дазваляе ставіць пытанні. І чым больш мы зможам знайсці адказаў на гэтыя пытанні, тым лягчэй стане ўсяму выставачнаму працэсу. Я не магу сказаць, што ў «Арт-Мінска» ёсць нейкая фундаментальная накіраванасць. Але «Арт-Мінск» павінен стаць «будаўніком», каб збіраць пазлы, якія адсутнічаюць.

**Алена РУСАКЕВІЧ**

# ЗЯМЛЯ Ў ІЛЮМІНАТАРЫ

## Тэорыя і практыка ператварэння ў сапраўднага палешука

Не трэба шукаць іншапланецян! Навошта, калі побач на зямлі шмат істот, кантакт з якімі прыпыніўся ці так і не быў канчаткова наладжаны. «Космас так блізка», — сцвярджаюць знаўцы. Самы просты спосаб выйсці ў яго — Купалаўскі тэатр, дзе на малой сцэне ідзе пастаноўка "Радзіва Прудок". Больш складаны (але зусім не напружвае) — праз чытанне кнігі Андруся Горвата, якая дала падставу для стварэння спектакля. Яшчэ адзін спосаб падаецца нерэальным, але і рэальным таксама (у аўтара ж атрымалася): паехаць жыць на Палессе. Гэта ўсё адно што выйсці ў адрыты космас, прынамсі, для жыхара сталіцы. Таму што асобы, якіх ён сустракае там, у паралельным свеце, патрабуюць асаблівых падыходаў у кантактах, асаблівай логікі для паразумення, а для перадачы сэнсу ім не трэба шмат слоў, часам дастаткова аднаго гуку (літары), каб перадаць глыбокі сэнс.

### …О?

«Твой переезд в Прудок связан с какой-то психологической травмой?» — спыталі ў героя кнігі. Само сабой просіцца гэтае пытанне. Мала таго, што гараджанін выправіўся жыць у вёску, у дзедаву хату, дык яшчэ і на Палессе, якое ўяўляецца дагэтуль месцам сакральна-некранутым, далёкім і не да канца зразумелым. Гэта нават не арбіта недзе «па-над», гэта паралельная галактыка, дзе іншыя законы гравітацыі, катэгорыя часу амаль адсутнічае (істотны сам факт, што ты ёсць) ды ў наяўнасці разумнае жыццё са сваімі прынцыпамі існавання. Усё выпрабаваў на сабе аўтар кнігі «Радзіва "Прудок"», за «персанальным эксперыментам» якога магла сачыць прасунутая зямная аўдыторыя дзякуючы вайфаю: гэта ж трэба, паехаў не ў Маскву, не ў Парыж, а ў беларускую вёску. Цяпер новы свет тут. І рамантыка тут.

Запісы з дзённіка — успаміны былога «зямнога» (прыземленага?) жыцця, назіранні і думкі пасля кантактаў з мясцовай цывілізацыяй — сталі кнігай. Кніга пайшла ў шырокую прастору — а гэта ўся прастора беларускага светаадчування, менталітэту, культуры, наогул жыцця. І хутчэй за ўсё спрацавала менавіта сіла зямнога прыцягнення і жаданне паглыбіцца ў свой неспазнаны Сусвет, бо наўрад ці гэтая кніга зацікавіць нерэальнай гісторыяй ці сюжэтам — яго там наогул няма! Ёсць назіранні, занатоўкі, кожная з якіх, здаецца, магла б быць аповесцю ці раманам, але пры гэтым у радках — жывых, рэальных словах, якімі карыстаюцца людзі — яшчэ столькі паэзіі… Менавіта таму жаданне паставіць гэтую кнігу ў тэатры падавалася ўтапічным: жыццё ў Прудку ідзе сваім ходам: ад стварэння Сусвету тут столькі жыхароў (аказваецца!), а колькі яшчэ тых герояў, якіх вывесці на сцэну немагчыма... Не пагадзіўся Раман Падаляка. Меў рацыю.

Актыўнасць чытачоў і захапленні наноў адкрытым сусветам прывялі да з'яўлення фільма «Ягор» і ўрэшце — да тэатральнай пастаноўкі, якую ажыццявіў той жа аўтар фільма, Раман Падаляка. Ён таксама частка беларускага космасу — акцёр-зорка. Цяпер ведаю дакладна: на начным небе сярод зіхатлівых зорак могуць быць планеты, якія маюць моцную атмасферу і энергетыку, здольную ўцягваць у сваю арбіту. У дадзеным выпадку яны зрэзаніравалі: космас, які спасцігаў Горват, і энергетыка Падалякі.

Яны абодва аднолькава разумеюць, чаму эротыка па-беларуску — гэта аголеная каленка Ганны Чарнушкі («Людзі на балоце» ідуць на сцэне Купалаўскага тэатра). А Купалаўскі тэатр — гэта таксама мікракосмас, які зацягвае ўсіх, хто трапляе ў зону яго прыцягнення. З акцёрамі зразумела. Але ж нават былога дворніка, якім працаваў галоўны герой, не прамінула гэтае наканаванне. Выбар працы для дворнікаў у Мінску неблагі, з варыянтамі аплаты: чым бліжэй да культуры — тым яна меншая, затое там у будучых дворнікаў могуць спытаць пра валоданне мовай… Калі чалавек зрабіў такі выбар у працы, то зразумела, што для яго сіла прыцягнення — з'ява не проста фізічная, а хутчэй філасофская.

Усё пазначана адразу: з першых рухаў па сцэне героя мы адчуваем яго наканаванне: камбінезон дворніка нагадвае скафандр. Далей адчуваем асаблівы космас Беларусі праз выяўленне часткі тэатральнай біяграфіі. Сусвет ахоплівае гледача праз мастацкі вобраз: умоўны касмічны стыль, што прыдумала мастачка Кацярына Шымановіч, вытрыманы ад пачатку да канца, і дазваляе канцэптуальна падтрымліваць галоўную думку. Вось яна, сюжэтнасць, намацаная праз метафізіку, дзе розныя малекулы-дробязі-эпізоды-часткі сінтэзуюцца ў агульную форму. Зоркі зіхацяць у чорнай прасторы малой сцэны — і бачыш, якая, яна, аказваецца, вялікая...

Каб больш зразумелыя былі палескія адчуванні, трэба было пачаць з гарадскіх, так і зрабіў Раман Падаляка-рэжысёр. У інсцэніроўцы, якую ён напісаў разам з артыстам Міхаілам Зуем, ёсць частка пра героя-дворніка, які ачышчаў снег на дарозе, па якой скакалі гарадскія козачкі на абцасах, слухаў прыгожую кітайскую мову ў тэатры падчас экскурсій для турыстаў, дзе ў якасці экзатычнага артэфакта маглі фігураваць шкарпэткі дворніка на батарэі (не, ну выпадкова!), слухаў мамін голас па тэлефоне з абавязковай неабходнасцю запэўніваць, што ўсё нармальна. Магчыма, так адказваюць блізкім касманаўты, якіх толькі прызначылі ў далёкую экспедыцыю, і патрэбны час, каб усіх падрыхтаваць. І тэатр для героя стаўся свайго роду цэнтрам падрыхтоўкі да касмічнай вандроўкі. Але «прыбіраць снег — усё адно што чысціць доўгую дарогу дадому»...

Ёсць адно скразное пытанне, адказ на якое мы шукаем на працягу спектакля: «Чаму прыехаў?» — «Захацелася». Нас падводзяць да адказу: чаму захацелася. Ён не гучыць прама, гэта і немагчыма. Ён перадаецца метафізічна. Прыходзіць як згадка і сінтэзуецца, нібыта з касмічнага пылу — нават яго можна гарманізаваць і стварыць свет ці адрадзіцца наноў.

### …А…

Старая дзедава хата напачатку як кропка сярод зорнага неба. Глядзіш на яе нібыта з нябесных вышынь. Адразу спазніўся «Салярыс» Таркоўскага з вандроўнікамі, якія рушаць даследаваць разумнае жыццё іншага паходжання, а ў выніку думкамі вяртаюцца да таго, што засталося далёка дома і яны носяць гэта глыбока ў сабе.

Але напрыканцы ўглядаюцца ў хаціну з утульнымі вокнамі і гасцінным ганкам. Наш касманаўт ідзе далей: ён спыняецца і даследуе тое, што ўнутры.

Пры набліжэнні да хаціны бачыш: ці не сам дзед глядзіць адтуль праз акно? Даўно няма дзеда, але падобны на яго сам герой — адзін твар з рысамі, што выявіла (запомніла?) шкло. Але самае цікавае пачнецца потым, у самой хаце і вакол яе. Новае жыццё падорыць новых сяброў, іншай формы розуму. Дзіўна было ўявіць, якім чынам можна на сцэне паказаць ката Рому. Але ён побач з героем — як выява на мяккай падушцы, і сапраўды ж можна вось так сядзець на старым сінім металічным ложку і гладзіць яго. Намаляваная і каза са званочкамі, якія дзінькаюць як пры дойцы, — ён назаве яе Цёця, у гонар былой гаспадыні. Муха Наташа абсалютна рэальная: так выглядае аніміраваны персанаж.

Услед за мастачкай Кацяй Шымановіч аўтар-аніматар відэараду Глеб Куфцерын дазваляе ў драматычным спектаклі стварыць лініі, якія важныя (смешныя, кранальныя) у кнізе, альбо абазначыць моманты асаблівага настрою ці атмасферы. Вось тут у студні-ілюмінатары бачныя і ўсе «іншасветныя» істоты: матылькі і мухі, якіх нават можна змахнуць рукой, месяц, які адбіваецца ў вадзе, «жывыя» кроплі дажджу. Усё тое, без чаго немагчымае было б адчуванне нашага зямнога космасу з чалавечым тварам.

Драматургічная «іншасць» героя падкрэсліваецца яго жаданнем пагаварыць — з радзіва. Яно грае асаблівую ролю ў спектаклі, такі ж «жывы» персанаж сярод іншых, хоць і рарытэтны прыбор з голасам, які, дарэчы, валодае сваёй логікай. Гэты скразны герой — альтэрэга персанажа, які сам сабе задае пытанні, разважае, прыходзіць да высноў. Здаецца, абодва безэмацыянальныя: радзіва з металічным голасам і артыст Міхаіл Зуй. Магчыма. Але ў іх узаемадзеянненні можна ўлавіць тут эмоцыю, якой не хапае вонкава (каб адчуць змены ў нашым касманаўце, трэба ўсё ж чытаць кнігу). Таму што ў ёй усё ж значна больш насельнікаў. Ставаральнікі спектакля вельмі стараліся выбраць самыя «тэатральныя» эпізоды, пры тым, што гэта ўсяго толькі драбніцы агульнага тэксту, у якім адлюстраваныя цудоўныя назіранні за жыццём…

Муха Наташа не дае спаць, настойліва цакоча над вухам — хочацца сачыць за яе лёсам. У чым праблема, здзівіцца жыхар гарадской кватэры, які прывык вырашаць пытанне радыкальна. Ну, і дарма: гэта ж На-та-ша!

Яна таксама мясцовы жыхар, частка экасістэмы, урэшце, часцінка Сусвету. Без яе карціна будзе няпоўнай. Карціна свету вачыма новага жыхара вёскі Прудок — дакладна. Карціна свету ката Ромы — таксама, ён той, хто дапамагае «акліматызавацца» — і за яго лёсам захочацца сачыць, па ім захочацца плакаць…

Слёзы наварочваюцца і пры знаёмстве з жывымі істотамі. Яны жывуць у Прудку, ён немагчымы без іх, а яны — без яго! Разам яны ўтвараюць калектыўны розум: людзі і месца. Часам абаяльныя і прывабныя, гасцінныя і добрыя, з граматамі за 30 гадоў працы і проста шаноўныя, спагадлівыя і тыя, што маюць асаблівую зацікаўленасць у вашай спагадзе. Часам яны здаюцца гуманоідамі (у адпаведным стане), але пры далейшых кантактах аказваюцца вельмі мілымі людзьмі з тонкай душэўнай арганізацыяй. Яны такія: падкажуць, як абыходзіцца з зямлёй, што садзіць, з кім пагаварыць. Усе вобразы вяскоўцаў увасабляюць Святлана Анікей (маладух і бабуль) і Дзмітрый Есяневіч (дзядоў і моцных дзецюкоў). Вялікая нагрузка на акцёраў, якія пераўвасабляюцца ад сцэны да сцэны: імкнуцца і дух захаваць, і персанаж паказаць прачула (таму прамаўляюць нетаропка, месцамі можа падавацца, што з-за гэтага замаруджваецца дзея). Але ў Прудку, з іншага боку, такое жыццё: тут ніхто нікуды не спяшаецца. Каб пераўвасобіцца, артыстам дастаткова дадаць нейкую дэталь гардэроба (тоўстыя вязаныя шкарпэткі ці нагавіцы, шапку ці швэдар) — у гэтым сэнсе стыль касмічнай вопраткі застаецца базавы: кожны прудковец — носьбіт таго асаблівага «паляшуцкага» космасу, у якім на месцы кожная датэль, расліна, мошка. Мае землякі-палешукі настолькі пазнавальныя з іх жыццёвай філасофіяй, што разумееш: гэта абсалютна самадастатковыя людзі, якія здолеюць перажыць любыя катаклізмы глабальнага характару і аднавіцца. Бо ў іх усё е.

### Е!

Гэтая адна ёмістая літара абазначае паляшуцкі дух і нават дыялект ва ўсім спектаклі, што ідзе на літаратурнай беларускай мове. Яна натуральна ўвайшла ў кнігу і дапамагае аўтару падкрэсліць каларыт месца, дзе ён жыве сабе, «выспявае як нацыя», спасцігае палескую філасофію, дзе ёсць свае інь-янь: мужчынкае змаганне — з абставінамі, за ўраджай, за жыццё, — заціснутае ў жаночае гараванне (як тут прынята). І не трэба думаць, што працэс гэты сумны, наадварот. Гараваць у палешукоў прынята, калі ёсць пра што падумаць, і нават калі ўсё добра (каб не сурочыць). І калі герой урэшце робіць гэта — абліваецца халоднай вадой з вядра, разумееш канчаткова: у ім такі прачнуўся «паляшуцкі ген» — рабіць, сеяць, капаць, касіць, абжывацца гаспадаркай. Каб сказаць, як усе тут: «е»!

Нават гэтай адной дэталі дастаткова, каб зразумець: «е» — гэта не літара. Гэта наяўнасць. Прысутнасць. Існасць. І неспазнанасць да канца.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

# Аксана Лясная: «Артыст прымае і аддае эмоцыі як транслятар»

Упартфоліа гэтай актрысы — удзел больш чым у пяцідзесяці фільмах і тэлесерыялах, сярод якіх беларускія «Масакра» і «Ваўкі», якія некалькі гадоў таму выклікалі гарачае абмеркаванне. Яе пазнаюць гледачы ў фільмах «Спакуса», «Бумеранг», «Снайпер. Зброя помсты», «Клянёмся абараняць», «Каменская», «Правінцыялка», «Супермаркет» і інш… Але сталічныя знаўцы тэатральнага мастацтва ведаюць і любяць Аксану Лясную па пастаноўках Рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага, дзе актрыса працуе.

**— Вашым галоўным педагогам у інстытуце была народная артыстка Беларусі Зінаіда Браварская, якая прысвяціла ўсё жыццё Купалаўскаму тэатру. Чаму вучыліся ў бліскучых прафесіяналаў?**

— Калі Зінаіда Іванаўна пачала з намі працаваць, ёй было больш за шэсцьдзясят. Яна была жанчына эфектная: мела выдатную постаць, хадзіла ў дзіўна прыгожых строях, на высокіх абцасах або дзесяцісантыметровай танкетцы. Мы, юныя дзяўчынкі, захапляліся жанчынай, якая сябе так падавала, нягледзячы на ўзрост, і хацелі на яе раўняцца. На занятках па акцёрскім майстэрстве яна паказвала, як трэба стаяць на галаве, як, робячы кульбіты, правільна групавацца, каб выглядала элегантна і па-акцёрску прыгожа. Яна ўсё гэта рабіла лёгка, гуляючы. Тады мы не ўсведамлялі, якая за гэтым стаіць грандыёзная праца над сабой, а сёння я разумею, наколькі яна была дзівосная жанчына і цудоўны педагог.

«У партнёры твая сіла», — казала яна. — «Калі сцэна не лепіцца, трэба "ўчапіцца" ў партнёра мацней, а не выпінаць сябе». Калі ты яшчэ малады акцёр, не зусім разумееш значэння гэтых слоў. Але калі з'яўляецца некаторы досвед, тады рэальна ўсведамляеш, што гэтая «вальтовая дуга», якая ўзнікае паміж акцёрамі, якраз і трымае ўвагу гледачоў. Самае галоўнае, чаму яна вучыла, — не забываць аб эмацыянальнай прыродзе прафесіі. Артыст прымае і аддае эмоцыі як транслятар. Усе яго нервовыя адчуванні павінны быць дакладна настроеныя і аголеныя, каб унутранае «я» акцёра ўключылася да таго, як ён адкрые рот.

Адным з маіх першых педагогаў быў Валянцін Руды. Наш курс набіраўся для Тэатра юнага гледача, а Валянцін Леанідавіч на той момант служыў галоўным рэжысёрам ТЮГа. Потым ён паехаў у Маскву і досыць доўга працаваў у Тэатры на Таганцы, а таксама займаўся выкладчыцкай дзейнасцю. А першае знаёмства з рэжысурай «звонку» адбылося падчас падрыхтоўкі дыпломнага спектакля «Жыццё Карыцына», які ставіў Мікалай Пінігін паводле беларускага драматурга Алены Паповай.

**— Вы пачыналі ў мінскім ТЮГу. З якіх роляў?**

— Пасля заканчэння тэатральнага інстытута мяне запрасілі на працу і ў ТЮГ, і ў «маладзёжку», але я абрала Тэатр юнага гледача, таму што там былі дасведчаныя, дарослыя акцёры, у якіх, я лічыла, змагу павучыцца. Сапраўды, мяне і астатніх маладых акцёраў сустрэлі вельмі добра. І цяпер я цёпла стаўлюся да гэтага тэатра.

Запомнілася праца з Ганнай Каменскай, якая ставіла спектакль «Петэр Мунк і яго каменнае сэрца» Гаўфа, у якім я выканала ролю Лізбет. Там жа я пазнаёмілася і з Мадэстам Абрамавым, які працаваў над спектаклем «Нечаканыя госці». А рэжысёрам па пластыцы ў гэтым праекце быў запрошаны Валянцін Гнеўшаў, сёння вядомы расійскі цыркавы рэжысёр і харэограф. Я была ў поўным захапленні ад працы з такім віртуозам, які ставіў у нашым спектаклі танцы і пластычныя бойкі. З ім прыехаў таксама малады танцор, які вучыў нас некаторым рухам брэйк-дансу, які ўваходзіў тады ў моду. Ён так крута гэта рабіў, а я думала: «Вось гэта жыццё вакол! Кіпіць!..» Усё толькі пачынаецца, паспявай хапаць, вучыцца... Гарбачоў, адкрыліся межы, і ў думках таксама была поўная перабудова....

Як сапраўдны малады артыст ТЮГа, я іграла цяжкага падлетка па мянушцы Жырафа з іракезам на галаве ў вельмі сацыяльным спектаклі «Уся надзея» паводле Міхаіла Рошчына і маладую гераіню ў спектаклі «Кабанчык» Віктара Розава, і самага высокага матылька-махаона ў казцы «Цалёвачка».

**— Вы працавалі і з Аляксеем Баталавым?**

— Не, проста была знаёмая. Падчас вучобы ў інстытуце пасябравала з курсам Аляксея Баталава: ён набіраў у Беларусі навучэнцаў для ВГІКа. Сярод іх былі Андрэй Бубашкін, Дзіма Іосіфаў. Яны мяне і пазнаёмілі з Аляксеем Уладзіміравічам. Мне здавалася, гэта нейкая касмічная асоба… Ён запрасіў сваіх студэнтаў на дачу, хлопцы паклікалі мяне. Мы размаўлялі, нешта чыталі ўголас, і я ў тым ліку. Баталаў мяне пахваліў і прапанаваў праслухацца ў Маскве. Але я не адважылася паехаць з Мінска тады, у канцы 1980-х.

**— Галоўным тэатрам у вашым жыцці стаў горкаўскі...**

— З ТЮГу я сышла ў дэкрэт, а праз некаторы час Барыс Луцэнка паклікаў у Рускі тэатр, куды збіраўся пераходзіць з Тэатра-студыі кінаакцёра. Некаторы час разважала, перажываючы, што ў мяне мала досведу. Але ўсё-такі рашылася, таму што не ўяўляла, што буду

рабіць у Тэатры юнага гледача праз некалькі гадоў з маёй фактурай і высокім ростам: пасталею, скончацца ролі маладых дзяўчат, і што потым? Цяпер рэпертуарная палітыка ТЮГа стала шырэйшая, і сёння там прадстаўлена розная драматургія, а ў тыя гады мы часцяком іграли па тры казкі ў дзень.

Барыс Луцэнка тады рабіў вельмі цікавыя праекты. Я даігрывала спектаклі ў Тэатры юнага гледача і адначасова ўдзельнічала ў рэпетыцыях прэм'ернага спектакля «Прасцячкі з нечаканых вастравоў», які ставіў Луцэнка ў тэатры імя Горкага. У лютым 1991 года цалкам перайшла ў Рускі тэатр. Тут я сустрэла народных артыстаў Савецкага Саюза Аляксандру Клімаву і Расціслава Янкоўскага, народнага артыста Беларусі Юрыя Сідарава. Якія імёны! Яны зрабілі цэлую эпоху ў тэатры.

Аляксандра Іванаўна і Расціслаў Іванавіч былі выдатнай парай на сцэне. У тэатры да гэтага часу памятаюць іх знакамітага «Макбета». А як яны іралі ў спектаклі «Двое на арэлях»! Уся зала аблівалася слязьмі... Ці спектакль «На залатым возеры», дзе яны былі пажылой парай, якіх накрывае старасць. Аднойчы муж выходзіць прагуляцца вакол дома і забывае дарогу назад... Ён вельмі беражліва да яе ставіўся, нейкія асаблівыя жарты ў іх былі, добрыя кпіны адзін з аднаго. На камернай сцэне акцёры знаходзяцца вельмі блізка да гледачоў. Хацелася выскачыць, дакрануцца да іх і сказаць: «Гэта вы, такія выдатныя, побач з намі, за паўтара метра, ствараеце цуд!..»

**— Што вам запомнілася з сумеснай працы з Расціславам Янкоўскім?**

— Я іграла з ім досыць шмат. Ён быў заўсёды вельмі прафесійны, ведаў свой тэкст з самага пачатку рэпетыцый і хацеў, каб партнёры таксама ведалі ўсё. Мог зрабіць важныя, выразныя заўвагі, быў вельмі чулым партнёрам.

Асабліва запомніўся выдатны спектакль «Хрыстос і Антыхрыст», які паставіў Барыс Луцэнка па Мережкоўскім. Галоўныя ролі — Пятра Першага і яго сына, царэвіча Аляксея, — выканалі Расціслаў Іванавіч і Аляксей Шадзько. Я іграла прынцэсу Шарлоту, а Ганна Маланкіна — жонку Аляксея…

Цікавай была праца ў спектаклі «Ваўкі і авечкі» па Астроўскім, які паставіў у нас маскоўскі рэжысёр Аркадзь Кац. Я іграла Яўлампію, Расціслаў Іванавіч — халасцяка Лыняева. Рабіў ён гэта вельмі гарэзліва: класічны герой-палюбоўнік, прыгажун, ён не саромеўся накладваць жывот з паралона, выходзіў на сцэну гэткім непаваротнем, які ляжыць на баку і гарбату папівае. Як ён ужыўся ў гэты вобраз, як абыгрываў яго, як садзіўся, як хадзіў... Ён смакаваў усе гэтыя сцэны. А я думала: вось яна — чароўная сіла мастацтва!

У спектаклі рэжысёра Аляксандра Карпава «Метэор» у суправаджэнні «Аркестра» (заснаванага на дзвюх п'есах — «Метэор» Дзюрэнмата і «Аркестр» Ануя) Расціслаў Янкоўскі іграў пісьменніка, разбітага дэпрэсіяй старога, які спаліў свае рукапісы. Мяне ён тады ўразіў глыбокай шчырасцю, ігрой не пафаснай, сапраўднай.

**— З кім з партнёраў праца запомнілася асабліва?**

— Добры партнёр — чалавек, з якім ты сугучны не толькі на сцэне, але і ў жыцці, і па адчуванні прафесіі. Мая любімая партнёрка — Вольга Клебановіч, мы з ёй ігралі ў спектаклі «Васа» Горкага, «Дзядзькаў сон» паводле аднайменнай аповесці Дастаеўскага. У 1990-х у тэатры доўга ішла выдатная камедыя «Амфітрыён», зала была поўная, нягледзячы на няпростыя часы. Я выканала вострахарактарную ролю царыцы Леды. У Вольгі Міхайлаўны была вялікая і вельмі смешная роля служанкі Харыты, а яе мужа іграў Саша Суцкавер. Амфітрыёна ўвасабляў Юрый Казючыц, Юпітэра — Алег Бажанаў, які працуе цяпер у Расіі. Галоўную гераіню Алкмену іграла Ганна Маланкіна. Выдатная каманда.

Адным з самых любімых партнёраў быў Сярожа Журавель. Яго ўжо няма, але не магу з гэтай думкай змірыцца, застаецца такое адчуванне, што ён паехаў некуды на працяглыя гастролі. Мы ігралі з ім у антрэпрызных спектаклях Мікалая Пінігіна «Дакрананне», «Вячэра з дурнем», а таксама «Жанчына і яе мужчыны» рэжысёра Алега Кірэева. З яго лёгкай рукі я досыць часта гучала на радыё. Спачатку адмаўлялася, але ён угаварыў, і з таго часу на мяне пасыпалася рэклама, агучкі, потым і радыёспектаклі. Адзін з іх пра Ефрасінню Полацкую, ставіла Настасся Пташук паводле п'есы Аляксея Дударава. З радыё я працягваю супрацоўнічаць і цяпер. Зімой мы скончылі спектакль «Сёстры Дастаеўскія», які паставіў Алег Вінярскі па п'есе беларускага пісьменніка Ягора Конева. Гэта гістарычны дэтэктыў, дзеянне якога разгортваецца ў ВКЛ у XVI стагоддзі. У мяне ў гэтым праекце вельмі добрыя партнёры: Уладзімір Мішчанчук, Андрэй Душачкін, Андрэй Кавальчук, Ігар Сідорчык, Аляксандр Шароў, Кацярына Яворская, Арнольд Памазан. Запіс праходзіў у шыкоўнай, прафесійнай студыі, дзе голас гучыць выдатна. А сам спектакль ідзе па-беларуску.

**— Якія з сучасных работ самыя любімыя?**

— Мне падабаецца ўсё мае ролі: і маленькія, і вялікія. Люблю характэрныя ролі, люблю камедыі, якія вельмі складана ставіць. Для працы над камедыйным спектаклем неабходна мець добрае пачуццё гумару, лёгкі розум, здольны лунаць над жыццём без сур'ёзнага паглыблення, а таксама пэўны перыяд у жыцці, каб табе хацелася гэта рабіць. Камедыі трэба смакаваць.

Адзін з маіх любімых спектакляў — «Ідэальны муж», які паставіў Аркадзь Кац па п'есе Оскара Уайльда. Гэта і шэкспіраўская «Дванаццатая ноч» у пастаноўцы Сяргея Кавальчыка, дзе я выконваю ролю Алівіі, і вельмі вясёлы спектакль гэтага ж рэжысёра — «Хітрыкі Ханумы». Падабаюцца дзве камедыі паводле твораў Алега Данілава «Лэдзі на дзень» і «Чацвёртая планета» Дзмітрыя Астрахана. З задавальненнем працую ў выдатным спектаклі «Зойкіна кватэра» па п'есе Міхаіла Булгакава, які паставіў малады рэжысёр з Масквы Павел Пронін.

У тэатры сёння ёсць выдатная сусветная класіка, амерыканскія і еўрапейскія творы XX стагоддзя, але было б добра, каб з'яўлялася больш п'ес сучасных рускамоўных аўтараў: сучасная драматургія на альтэрнатыўных пляцоўках вельмі запатрабаваная.

**— Верагодна, сучаснай тэмы ў вас шмат у кіно?**

— У кіно ў мяне склалася, на жаль, пэўнае амплуа: жалезная бізнес-лэдзі, фрау, пагардлівая арыстакратка і г. д. Мабыць, кінарэжысёры выбіраюць мой твар з досыць вострымі рысамі. Але, мне здаецца, цікавей іграць адваротную гісторыю.

Адны з першых работ былі ў расійскіх серыялах: «Паскораная дапамога» і «Цёмны конік». У Аляксандра Велядзінскага, рэжысёра, які пазней зняў фільм «Географ глобус прапіў», працавала ў серыяле «Закон». Маргарыта Касымава адкрыла мяне для беларускага кіно. Запрасіла на пробы фільма «Спакуса» паводле сцэнарыя Алены Паповай, і я прайшла. Пазней з'явіліся ролі, якія мне вельмі падабаліся і запомніліся, у беларускіх фільмах «Масакра» Андрэя Кудзіненкі і «Ваўкі» Аляксандра Колбышава. Прыцягвае, калі рэжысёр разам з табой шукае на здымачнай пляцоўцы, як сцэнарый зрабіць захапляльным, каб усё было жыццёвым, каб глядач бачыў, як персанаж мяняецца на працягу спектакля або фільма, пераадольваючы перашкоды, унутраныя і знешнія, імкнучыся зрабіць наш свет лепшым. Здаецца, у гэтым сэнс, што дадзены нашай акцёрскай прафесіі.

**Вольга САВІЦКАЯ**

# З ДУМКАМІ ПРА РАДЗІМУ

## Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2018» сустракае гасцей

**Адметнасць фестывалю 2018 года — акцэнт на тэмах Года малой радзімы і 80-годдзі Міншчыны, а таксама жыцці і творчасці народнага артыста СССР і Беларусі Ігара Лучанка, якому ў жніўні споўніцца 80 гадоў.**

### МАЛАДОСЦЬ-ПЛЯЦ

Гэтым разам фестывальнымі пляцоўкамі Маладзечна сталі Летні амфітэатр, Палац культуры, Мінскі абласны краязнаўчы музей і Мінскі абласны драматычны тэатр, дзіцячая школа мастацтваў, парк Перамогі, Чысцінскі сельскі Дом культуры. Пра Год малой радзімы нагадаюць мясцовыя калектывы, якія з'явяцца на канцэртнай пляцоўцы ў праграме «Фестывальная талака», а таксама экспазіцыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і выстаўка-продаж тавараў народнага спажывання, якія будуць працаваць на цэнтральнай плошчы на працягу двух фестывальных дзён.

— Маладзечанскіх калектываў, якія возьмуць удзел у мерапрыемстве, многа: выступіць на Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі сярод лепшых з лепшых — вялікі гонар, — распавяла дырэктар Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Маладзечанскага раёна Ганна Уладыка. — У нашым раёне загадзя праводзілі конкурс эстрадных выканаўцаў і конкурс «Паклон табе, мой беларускі край» для вакальна-харавых калектываў, каб вызначыць найбольш падрыхтаваных і таленавітых артыстаў. На сцэну выйдуць лепшыя калектывы па выніках конкурсаў і пакажуць адмысловую праграму з тэкстамі беларускіх паэтаў-песеннікаў.

Першыя мерапрыемствы фестывалю распачнуцца сёння ў Палацы культуры, дзе пройдуць 2-і і 3-і тур рэспубліканскага этапу Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні (выступленні заключнага этапу пакажуць у суправаджэнні заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі»). Палац культуры задзейнічаны не толькі як канцэртная пляцоўка. Пасля выступаў таленавітых спевакоў тут можна паглядзець работы не менш адораных мастакоў: а 5-й гадзіне адбудзецца адкрыццё выстаўкі карцін «Наша малая Радзіма вачыма мастакоў свету» ад удзельнікаў пленэру «Святасць зямлі беларускай». Гэта не адзіныя складнікі мастацкай праграмы «Маладзечна-2018»: запланаванае адкрыццё выстаўкі графікі «Меер Аксельрод. Вяртанне дадому» і мастацкі пленэр.

Увечары жыхароў і гасцей Маладзечна чакае ўрачыстае адкрыццё фестывалю, падчас якога ўзнагародзяць лаўрэатаў Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні.

*Фота Кастуся Дробава.*

### СПАДЧЫНА Ў ПЕСНІ

Разам з новымі імёнамі прагучаць і даўно вядомыя: канцэрт «Мелодыя лёсу» прысвячаецца юбілею народнага артыста Беларусі і СССР кампазітара Ігара Лучанка. Пачаткоўцы і папулярныя спевакі выканаюць творы Лучанка ў суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Канцэрт падкрэслівае ўнёсак, які лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі зрабіў у гісторыю беларускай музычнай справы. На яго рахунку — значныя акадэмічныя творы і самабытныя песні, на якіх выраслі некалькі пакаленняў беларусаў, музыка для дзяцей. Мелодыю Лучанка «спяваў» нават гадзіннік на мінскай ратушы! Разам з папулярнымі шлягерамі вядомай стала і музыка кампазітара да драматычных спектакляў, радыё- і тэлепастановак, кінафільмаў. Акрамя творчай працы, Ігар Лучанок мае і шмат іншага клопату: былы рэктар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі) з 1980 года аб'ядноўвае творцаў ды музыказнаўцаў у якасці старшыні Саюза кампазітараў Беларусі.

Лірыка-рамантычныя творы Ігара Лучанка даўно сталі візітоўкай сучаснай беларускай нацыянальнай песні. Выключная самабытнасць яго музыкі, як і пранікнёныя словы песень, хутка зрабілі іх папулярнымі і любімымі. Складана знайсці беларуса, які б не ведаў шлягеры «Мой родны кут», «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Спадчына», «Алеся», «Верасы», «Калі б камяні маглі гаварыць», «Майскі вальс». У творах кампазітара гучала асабістая для беларускага народа тэма Вялікай Айчыннай вайны (вакальна-сімфанічная паэма «Вайна не патрэбна», «Хатынь», «Ліст з 45-га» ды інш.), тэксты вершаў беларускіх класікаў — Якуба Коласа і Янкі Купалы, Петруся Броўкі. Так, паэма-паданне «Гусляр», напісаная разам з «Песнярамі» на словы Янкі Купалы (дарэчы, як і кантата «Курган»), стала адной з першых рок-опер у Савецкім Саюзе.

У заключны дзень фестывалю на канцэрце «Гэй, узвейцеся сваім крыллем...» (верш Янкі Купалы «Арлянятам») загучыць акадэмічная музыка ў выкананні творчых калектываў Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі, а таксама пройдзе гала-канцэрт закрыцця «Маладзечанскі зарапад». На творчай сустрэчы «Асобы эпохі» арганізатары прапануюць задаць пытанні заслужанай артыстцы Рэспублікі Беларусь Тамары Раеўскай, у выкананні якой прагучалі песні Яўгена Глебава, Ігара Лучанка, Эдуарда Ханка ды іншых вядомых беларускіх кампазітараў.

### ГАСЦЁЎНІ ДЛЯ СУСТРЭЧ

Для тэатралаў у межах фестывалю падрыхтавалі паказ спектакляў «Вечар» па п'есе Аляксея Дударава ад Мінскага абласнога драматычнага тэатра і «Кар'ера доктара Рауса» з рэпертуару Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі (на сцэне канцэртнай залы Палаца культуры). Тэматыка «Вечара» (праблема «выміранння» беларускіх вёсак) арганічна спалучаецца з тэмай Года малой радзімы, а «Кар'ера доктара Рауса» нагадае гледачам пра значную леташнюю падзею — 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, якое падкрэслівае гістарычную глыбіню айчыннай культуры.

Да арганізацыі фестывалю далучыўся і Саюз пісьменнікаў Беларусі: падчас музычнай гасцёўні «Малая Радзіма — пачатак мой і выток», арганізаванай на галоўнай сцэне Палаца культуры Маладзечна, слухачы даведаюцца як адчуваюць радзіму беларускія паэты. На фэсце выступяць прадстаўнікі ўсіх абласцей Беларусі, прачытаюць вершы творцы розных пакаленняў — прызнаныя паэты Міхась Башлакоў, Мікола Мятліцкі, Міхась Пазнякоў, маладая паэтэса Юлія Алейчанка ды лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Дэбют» Маргарыта Латышкевіч. Творчая група СПБ наведае Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка», завітае ў студыю маладзечанскага тэлебачання (перадача «У аб'ектыве»), дзе возьме ўдзел у стварэнні адмысловага выпуску праграмы.

Далучыцца да выступленняў артыстаў можна не толькі ў Маладзечне: тэлеканал «Беларусь-3» будзе трансляваць канцэрт-адкрыццё XVIII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2018», а таксама вялікі канцэрт закрыцця «Маладзечанскі зарапад», дзе выступяць такія зоркі беларускай эстрады, як Ядвіга Паплаўская, Аляксандр Саладуха, Ірына Дарафеева, Алёна Ланская, Іна Афанасьева, Надзея Мікуліч, Аляксей Хлястоў, Саша Нэма, Настасся Ціхановіч, Іскуі Абалян, Герман, вакальны гурт «Чысты голас», гурт «Дразды» ды іншыя выканаўцы.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.**

# Балет *non-stop*

**Харэаграфічны фестываль «Балетнае лета ў Вялікім», які штогод ладзіцца напрыканцы сезона ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры Беларусі, адбываецца ў Мінску.**

Традыцыйна падчас «Балетнага лета» тэатр паказвае прэм'еры, створаныя за апошні сезон, лепшыя спектаклі мінулых гадоў, а таксама запрашае на сваю сцэну зорак сусветнага балета. «Балетнае лета — 2018» распачалося з першага паказу балета «Пятрушка» Ігара Стравінскага, для пастаноўкі якога быў запрошаны народны артыст Расіі Андрыс Ліепа. Для беларускіх гледачоў падрыхтавалі адмысловы сюрпрыз: дадалі да «Пятрушкі» балеты «Шахеразада» Мікалая Рымскага-Корсакава і «Жар-птушку» Стравінскага, каб скласці паўнавартасны зварот да «Рускіх сезонаў» Сяргея Дзягілева.

У суботу запрашаюць далучыцца да апошняга паўстання рабоў Старажытнага Рыма на праглядзе адноўленага «Спартака» Арама Хачатурана ў пастаноўцы Валянціна Елізар'ева. Пасля вядомага «Спартака» — новая пастаноўка балета «Карсар» (музыка Адольфа Адана, Цэзара Пуні, Леа Дэліба, Рыкарда Дрыга, Пятра Альдэнбургскага), першы паказ якога адбыўся сёлета. Па традыцыі фестывалю, выконваць галоўную партыю ў спектаклі запрошаны замежны госць — саліст Вялікага тэатра Расіі Міхаіл Лабухін. Міхаіл Лабухін — сябра беларускай сцэны: раней ён танцаваў Базыля ў «Дон Кіхоце», а таксама браў удзел у гала-канцэрце «Балетнага лета» мінулых гадоў. Расійскія артысты задзейнічаны і ў «Лебядзіным возеры» П. Чайкоўскага, якое пакажуць 11 чэрвеня: партыю Адэты-Адыліі выконвае салістка Міхайлаўскага тэатра Аксана Бондарава, прынца Зігфрыда — саліст Марыінскага тэатра Ігар Колб. У праграму «Балетнага лета — 2018» уключылі і прэм'еру мінулага сезона, якая не паспела патрапіць на гэты ж фестываль летась, — балет «Ор і Ора» («Людзі і птушкі») ад балетмайстра-пастаноўшчыка Аляксандры Ціхаміравай.

Напрыканцы фестывалю — гала-канцэрт зорак сусветнага балета (дырыжоры — Алег Лясун і Вячаслаў Чарнуха-Воліч), дзе будуць спалучацца нумары класічнай і сучаснай харэаграфіі. Першы намеснік генеральнага дырэктара Вялікага тэатра Беларусі Уладзімір Рылатка распавёў, што акрамя лепшых танцораў Вялікага тэатра Беларусі да беларускай аўдыторыі выйдуць прыма-балерына Берлінскага дзяржаўнага балета Ксенія Аўсянік, кітайскі танцоўшчык і харэограф Ісян Чжан, саліст балета дрэздэнскай оперы і тэатра Дортмунда Дзмітрый Семіонаў, салісты Нацыянальнага тэатра оперы і балета «Эстонія» Алена Шкатула і Яўгеній Грыб, прэм'ер лонданскага Каралеўскага балета Іван Путроў. Абмінаць гала-канцэрт увагай аматарам балета супрацьпаказана: беларускаму гледачу рэдка даводзіцца ўбачыць на роднай сцэне замежныя навінкі, без якіх нельга зразумець тэндэнцыі развіцця харэаграфічнага мастацтва ў свеце.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

Сілуэты Спадчыны

Аўтарскі праект Уладзіміра Цвіркі

# СТАРЫЯ ПЕСКІ

*Паўночная брама сядзібы Пуслоўскіх (в. Старыя Пескі).*

**Буду пісаць пра тое, што засталося ад колішняй сядзібы Пуслоўскіх. Пра тое, што трэба абавязкова зберагчы, каб нашы нашчадкі, атрымаўшы ў спадчыну гэтыя кроплі ад багатага мінулага, бачылі і разумелі: мы ў свой час вельмі імкнуліся захаваць дзеля будучыні архітэктурныя каштоўнасці і рабілі ўсё магчымае, каб наступныя пакаленні памяталі, хто мы і адкуль.**

Хачу распавесці пра ўязную браму, якая захавалася ў вёсцы Старыя Пескі на Бярозаўшчыне. Але спачатку згадаю яшчэ адну браму — у вёсцы Жырмуны Лідскага раёна. Ёсць адна адметная акалічнасць, якая аб'ядноўвае два помнікі архітэктуры. Гэта дарогі, якія і сёння бягуць праз брамы. Вы можаце здзівіцца: ну і што тут такога? На тое яны і брамы, каб праз іх ездзіць. Але ж… стан гэтых збудаванняў ужо не той, ды і тэхніка, якая ходзіць праз іх, стала больш магутнай і шырокай. Пашкодзіць такую браму зусім не складана. Што ж адбылося ў Жырмунах? Гэты архітэктурны помнік, які захаваўся ад былой сядзібы Радзівілаў, зусім нядаўна зачапілі вялікай тэхнікай, ды настолькі, што паўстала пытанне пра канчатковы знос.

На старапескаўскай браме ўжо відаць пакуль яшчэ нязначныя пашкоджанні арачных сцен. Не хацелася б, каб гэты архітэктурны помнік напаткаў лёс жырмунскай брамы. Можна сказаць, што другой дарогі няма… Калі здарылася непапраўнае, у Жырмунах знайшліся ажно два шляхі, па якіх можна аб'ехаць разбураную браму. Такія падзеі засмучаюць, але, можа, яны нас падштурхнуць, каб мы зрабілі нейкія высновы, глядзелі трошкі наперад, каб потым не шкадаваць.

Пуслоўскую браму ў Старых Песках я лічу самай прыгожай з тых, якія захаваліся ў Беларусі. Яна — быццам фантастычны партал ва ўчарашні час. Пойдзем, сябры, разам праз яе.

Крыху больш за тры стагоддзі гэтымі землямі валодаў знакаміты і заможны шляхецкі род Вялікага Княства Літоўскага Пуслоўскіх. Недзе з самага пачатку XVII стагоддзя і ажно да 1939 года прадстаўнікі гэтага роду не толькі адбудоўвалі адну з найпрыгажэйшых сядзіб рэгіёна, але і з ахвотай садзейнічалі будоўлі дарог, млыноў і розных прадпрыемстваў, былі фундатарамі храмаў і палацаў. У суседнім мястэчку Хомск шмат гадоў працавала суконная фабрыка, вырабы якой неаднаразова атрымлівалі высокія ўзнагароды на прамысловых выстаўках. У вёсцы Альшэва, што таксама побач з Пескамі, быў пабудаваны прыгожы касцёл з радавой пахавальняй. Шмат чаго было знішчана. І толькі на малюнках Напалеона Орды можна ўбачыць, наколькі маляўнічай і шыкоўнай была сядзіба Пуслоўскіх: з палацам, паветранымі млынамі, вялізным пейзажным паркам, які прывольна раскінуўся ад палаца і аж да берагоў возера Чорнага, хаваючы пад вершалінамі дрэў разнастайных парод штучныя сажалкі.

Значныя страты прынеслі Пуслоўскім 30-я гады мінулага стагоддзя. Агонь паглынуў суконную фабрыку, неўзабаве згарэў і палац. Пад сядзібны дом часова прыстасавалі будынак канюшні. Мара адбудаваць новы палац так і не здзейснілася. Акрамя двух брам тут яшчэ можна ўбачыць дом, перароблены з канюшні, рэшткі сядзібнага парку з сажалкамі. А ў Альшэва сярод поля ўздымаецца цагляная вежа. На гэтым месцы раней былі гаспадарчыя пабудовы.

Заходняя брама, якая сустракае мяне першай, на выгляд больш сціплая, у ёй адсутнічаюць вежы, а галоўны праезд наогул у свой час быў замураваны. Брама, на жаль, у руінах. І з кожным годам яна разбураецца ўсё больш. На вачах мы губляем чарговы архітэктурны помнік, неад'емную частку сядзібна-паркавага комплексу Пуслоўскіх.

Іншая справа — Паўночная брама. Яе магутны стан, велічнасць, замкава-гатычны стыль уражваюць здалёк, нібыта гэта частка нейкага чароўнага замка. Не. Архітэктурны цуд тут у адзіноце. Узнёслыя вежы брамы, высока ўзняўшы свае галовы, упрыгожаныя зубчастымі шлемамі, пільна ўглядаюцца з мінулага праз стагоддзі ў сённяшні час, прыглядаюцца да тых, хто падыходзіць да брамы. І здаецца, толькі гэтым вежам-вартаўнікам трэба быць удзячным за тое, што захавалі, зберагліі архітэктурную каштоўнасць.

Вялізны арачны праезд, вышынёй каля васьмі метраў, зверху ўпрыгожаны як быццам кратамі, якія паднялі ўгару вельмі-вельмі даўно. Паднялі вартаўнікі краты, а самі кудысьці адышлі і… не вярнуліся. Так і стаіць гэтая брама адкрытая, гасцінна запрашаючы зайсці пад яе скляпенні, пераступіць нябачную мяжу паміж сучаснасцю і ўсім тым, што было ў захапляльным мінулым…

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Тацяна Арлова, Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламёдаў, Вольга Дадзіёмава, Жана Запартыка, Анатоль Казлоў, Алесь Карлюкевіч, Анатоль Крэйдзіч, Віктар Кураш, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"». Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк 07.06.2018 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 1454

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004 г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Індэкс 220013

Заказ — 2110

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.